№№23–24
(2751–2752)

15 лютага 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

*Якуб КОЛАС*

# Народная Воля

**Да ўвагі!**
**Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

*Шаноўныя чытачы!*
*Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.*

**ПАЛІТЫКА**

## *Пасол Расіі прадказвае саюзны рэферэндум*

**"Скончацца выбары ў Расіі, мы вернемся да стварэння Канстытуцыйнага акта. У кіраўніцтва Расіі і Беларусі няма альтэрнатыўных шляхоў, як нарошчваць супрацоўніцтва. Гэтую працу трэба актывізаваць ", — заявіў пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў падчас апошняй прэс-канферэнцыі.**

Пасол Сурыкаў лічыць, што галоўнай задачай Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы, які не могуць прыняць ужо доўгія гады, павінна быць *"фарміраванне прававога поля, у якім не будзе магчымым сутыкненне нацыянальных і саюзных структур"*, перадае "Інтэрфакс".

Па словах пасла, усе змяненні ў саюзнай дзяржаве павінны быць праведзены праз нацыянальныя канстытуцыі, каб пазбегнуць сутыкнення або перасячэння саюзных інтарэсаў з нацыянальнымі. Змяненне ж канстытуцыі як у Беларусі, так і ў Расіі, нагадаем, можа быць толькі праз рэферэндум.

## *Андрэй Кім знаходзіцца ў СІЗА*

**Ужо амаль два тыдні 21-гадовы Андрэй Кім знаходзіцца ў следчым ізалятары на вул.Валадарскага.**

Нагадаем, ён быў схоплены падчас апошняга мітынгу прадпрымальнікаў і абвінавачаны ў збіцці супрацоўніка ДАІ. Адразу пасля адбыцця 10-сутачнага адміністрацыйнага арышту Андрэй быў змешчаны ў СІЗА.

*"Сітуацыя з нашым сябрам Андрэем Кімам ускладняецца штодзень,* — распавядае Крысціна Шацікава.— *На хлопца моцна ціснуць псіхалагічна: некалькі дзён таму яму гвалтоўна пагалілі галаву (у яго былі прыгожыя доўгія валасы), зараз пракуратура падала заяву аб правядзенні псіхіятрычнай экспертызы. Прагназаваць штосьці, тым больш напярэдадні новага мітынгу прадпрымальнікаў, вельмі-вельмі цяжка. Палітвязні, якія ўжо добра "раскручаны", вызвалены, на іншых актывістаў заводзяцца крымінальныя справы. Улада, з аднаго боку, паказвае, што яна яшчэ трымае сваю лапу на апазіцыі, з іншага ж боку, нам кажуць, што прыйдзе час — адпусцяць і Андрэя, але пад рэпрэсіўную машыну патрапіць нехта іншы. Я не ведаю, як магчыма знішчыць гэты страшэнны кругаварот".*

Чым жа можна дапамагчы ў даны момант Андрэю?

*"Кожны чалавек можа падтрымаць мужнага Андрэя лістамі,* — кажа Крысціна. — *Нам ён піша, што яму вельмі не хапае лістоў і інфармацыі. Яго ізалююць: падпіску на газеты не дазваляюць, спатканні з маці таксама забараняюць. Падстава: маўляў, ёсць здагадка аб верагодным разгалошванні тайны следства".*

З заклікам падтрымаць Андрэя Кіма выступіў і вядомы расійскі журналіст Віктар Шэндэровіч. Як высветлілася, ён асабіста знаёмы з Андрэем і гаворыць пра яго так: *"Я ведаю Андрэя некалькі гадоў. І стаўлюся да яго так, як не часта можна ставіцца да маладых людзей, — паважаю яго. Ён робіць уражанне вельмі цэльнага і сталага чалавека. А арганізацыя, у якой ён працуе, аб'ядноўвае хрысціянскіх актывістаў, якія дапамагаюць старым".*

Напісаць Андрэю Кіму можна па наступным адрасе:

220050, Рэспубліка Беларусь, г.Мінск, вул.Валадарскага, 2, СІЗА-1, камера 39, для Кіма Андрэя Іванавіча.

**Алег СНОЎ.**

**ВІНШУЕМ!**

## *Маленькі подзвіг беларускіх біятланістаў*

**У мінулы аўторак на чэмпіянаце свету ў Швецыі беларускія біятланісты ў змешанай жаноча-мужчынскай эстафеце сенсацыйна заваявалі сярэбраныя медалі.**

Апошнім часам наш біятлон трапіў у такі стан, які прынята называць "паміж небам і зямлёй". Гучныя імёны адышлі ў гісторыю, новых не было амаль ні бачна, ні чутно. Даводзілася назіраць за тым, як нашы страляючыя лыжнікі "целяпаюцца" апошнім часам сярод дваццатых-шасцідзесятых нумароў. І тут — самая сапраўдная сенсацыя! Эстафетная чацвёрка беларусаў у складзе **Людмілы Калінчык**, **Дар'і Домрачавай**, **Рустама Валіуліна і Сяргея Новікава** заваявала "серабро" ўслед за немцамі!

*"Мы верылі і рыхтавалі каманду да таго, каб яна "выстраліла" менавіта на чэмпіянаце свету,* — кажа дзяржтрэнер па біятлоне **Аляксандр БЯЛЯЕЎ**. — *Планавалі, каб у эстафетах нашы спартсмены трапілі хаця б у васьмёрку мацнейшых, але на такое, шчыра прызнаемся, і не разлічвалі. Хлопцы і дзяўчаты здзейснілі проста подзвіг".*

**Алесь СІВЫ.**

**АНОНС!**

*Сяргей ДУБАВЕЦ*

# Востраў Ікарыя

*Эсэ пра Ігара Герменчука*

**"...Вызначыўшы Ігара як героя, мне заставалася толькі знайсці ягоны правобраз. Гэта Ікар. Такі самы безаглядны і адданы свайму палёту, як безаглядны і адданы сваёй справе быў Ігар Гермянчук. І скончыліся абедзве гісторыі аднолькава..."**

*(Гл. стар.7).*

**ГУЧНАЯ СПРАВА**

*Аляксандр БАРОЎСКІ:*

# «Шчыра кажучы, гэта ўсё страшна...»

*12 лютага ў Вярхоўным судзе распачаўся судовы працэс над былым кіраўніком канцэрна "Белнафтахім" Аляксандрам Бароўскім.*

### Група падтрымкі

Ля ганка Вярхоўнага суда стаяла некалькі дзесяткаў чалавек. Плакатаў у іх не было, ніякіх лозунгаў яны не выкрыквалі, але некаторыя з іх сказалі журналістам, што прадстаўляюць прадпрыемства "Белшына", на якім пачынаў свой працоўны шлях Бароўскі і якім у свой час кіраваў: маўляў, прыйшлі падтрымаць абвінавачанага. Праўда, у судовай зале гэтых людзей не было. Чаму — невядома.

Дарэчы, калі адбываліся суды над былым дырэктарам Мінскага трактарнага завода **Міхаілам Лявонавым** і экс-гендырэктарам "Нафтана" **Канстанцінам Часнавіцкім**, каля суда звычайна збіраліся толькі іх родныя і журналісты.

У судзе прагучала, што прадстаўнікі ААТ "Белшына" тройчы звярталіся да А.Лукашэнкі з просьбай аб вызваленні Аляксандра Бароўскага, аднак кожны раз з Адміністрацыі прэзідэнта атрымлівалі звычайныя адпіскі. Як вынікае з дакумента, на які спаслаўся суддзя, зварот да А.Лукашэнкі ў абарону Бароўскага падпісалі каля трох тысяч чалавек!

З вядомых асоб маральна падтрымаць Аляксандра Бароўскага прыйшоў толькі кіраўнік прадстаўніцтва расійскай кампаніі "РусНафта", былы кіраўнік Магілёўскага аблвыканкама **Міхаіл Дражын**. Ён крыху хваляваўся, што яго могуць не прапусціць па службовым пасведчанні. Аднак Міхаіл Уладзіміравіч зайшоў у судовую залу без якіх-небудзь перашкод, павітаўся і перакінуўся некалькімі фразамі з роднымі Бароўскага, памахаў яму рукой і... літаральна праз хвіліну сышоў.

### Суддзя

Справу Бароўскага разглядае суддзя Вярхоўнага суда

**Мікалай Грынцэвіч**. Ён падрабязна патлумачыў прысутным нормы і правілы паводзін. Звярнуў увагу на тое, што судовае разбіральніцтва *"далёкае ад элементаў тэатральнасці"*, таму эмоцыі трэба выключыць.

На працягу пасяджэння суддзя да месца сыпаў прымаўкамі і прыказкамі, чым не раз выклікаў шчырую ўсмешку ў некаторых прысутных у зале.

### Герой дня

Аляксандр Бароўскі сядзеў у клетцы. Выглядае былы кіраўнік "Белнафтахіма" няблага — можа, толькі крыху схуднеў. Знешне трымаўся вельмі ўпэўнена, нават бадзёра, раз-пораз з усмешкай ківаў жонцы і дачцэ, якія таксама прысутнічалі ў зале.

Былога кіраўніка "Белнафтахіма" абвінавачваюць у злоўжыванні ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі.

Інтарэсы Бароўскага прадстаўляюць два адвакаты. Аднак абодва яны адмаўляюцца ад каментарыяў. Нават не кажуць, ці скардзіцца Бароўскі, напрыклад, на дрэнны стан здароўя.

Родныя Бароўскага ад каментарыяў таксама ўстрымліваюцца.

Рабіць фота- і відэаздымкі Бароўскага суддзя не дазволіў. Дый і сам абвінавачаны заявіў, што супраць гэтага.

*"У мяне ёсць на гэта падстава,* — сказаў ён. — *Я да журналістаў стаўлюся з вялікай павагай, многіх ведаю асабіста. Але за восем месяцаў, што правёў у СІЗА, я столькі пра сябе начытаўся, што ведаеце... Шчыра кажучы, гэта ўсё страшна..."*

"Няма тае хусты, каб завязаць людзям вусны", — пачуў у адказ Бароўскі.

### Хадайніцтвы

Дачка і цешча экс-кіраўніка "Белнафтахіма" напісалі пісьмовыя хадайніцтвы аб тым, каб суд зняў арышт з іх маёмасці.

Так, дачка Бароўскага Ю.Налівайка падала хадайніцтва аб вызваленні з-пад арышту аўто "Сузукі-Гранд" 2004 года выпуску, аднапакаёвай кватэры па вуліцы Сухой і трохпакаёвай па вуліцы Мельнікайтэ ў Мінску, а таксама зямельнага ўчастка ў Асіповіцкім раёне, уладальніцай якіх яна з'яўляецца.

Дачка Бароўскага сцвярджае, што яе скаргі былі пакінуты без задавальнення, а арышт маёмасці, якая належыць ёй асабіста, яна лічыць незаконным.

Аналагічнае хадайніцтва напісала і цешча Бароўскага. Следства наклала арышт на дзве кватэры ў Бабруйску, уладальніцай якіх яна з'яўляецца. Жанчына абураецца: маўляў, следчыя не звярнулі ўвагі ні на яе сталы ўзрост, ні на яе заслугі перад радзімай, з-за чаго яна адчувае сябе прыніжанай.

Прадстаўнік пракуратуры Сяргей Целяжэвіч гэтыя хадайніцтвы не падтрымаў. Следства лічыць, што гэтая маёмасць магла набывацца на грошы Бароўскага, таму здымаць арышт заўчасна.

Аднак адзін з адвакатаў Бароўскага заявіў: *"У матэрыялах крымінальнай справы няма ніводнага доказу таго, што гэтая маёмасць набытая на грошы майго падабароннага".*

Савет ветэранаў працы ААТ "Белшына" прасіў, каб у працэсе браў удзел грамадскі абаронца. Як прагучала ў судзе, калектыў ААТ "Белшына" быў узрушаны навіной аб арышце Бароўскага па абвінавачанні ў крадзяжы і злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, калектыў добра ведае Бароўскага (ён пачынаў працу на "Белшыне" простым электраманцёрам і рос у іх на вачах), Бароўскі праявіў сябе як добрасумленны чалавек, і ягонае імя залатымі літарамі напісана на двух бабруйскіх цэрквах.

Абаронцы экс-кіраўніка "Белнафтахіма" хадайнічалі аб правядзенні фінансава-эканамічнай экспертызы, а таксама аб накіраванні судовага звароту ў "Цюменскую нафтавую кампанію", дзе ў сакавіку 2007 года нібыта была закуплена нафта па адной цане, а прададзена па больш высокай.

*"Мяне абвінавацілі ў нанясенні страт, а разлікаў ніякіх няма,* — настойваў на хадайніцтве Бароўскі. — *Следства абяцала мне правесці гэтую экспертызу, яе павінны ўжо былі правесці, але чамусьці не зрабілі. Нельга, каб абвінавачанне грунтавалася на розніцы кошту нафты ў 330 і 350 долараў за тону..."*

Пракурор не падтрымаў і гэтае хадайніцтва: маўляў, у спісе сведкаў, якіх плануецца выклікаць у суд, ёсць прадстаўнікі вышэйназванай нафтавай кампаніі, і яны могуць даць адказы на ўсе пытанні.

Але суддзя ўсё ж прыняў хадайніцтва Бароўскага да разгляду.

Суддзі патрэбен быў час, каб вырашыць некаторыя хадайніцтвы, таму судовы працэс перанеслі.

"Народная воля" будзе сачыць за лёсам Аляксандра Бароўскага.

### Просьба

Калі людзі ў форме сказалі ўсім прысутным пакінуць судовую залу, Бароўскі папрасіў журналістаў: *"Пішыце, калі ласка, праўду..."* І сказаў, што ён не прызнае сябе вінаватым.

**Марына КОКТЫШ.**

**АФІЦЫЙНА**

**Аляксандр Бароўскі быў затрыманы 29 мая 2007 года.**

**Былы генеральны пракурор Пётр Міклашэвіч казаў журналістам, што ў адносінах да Бароўскага ўзбуджана крымінальная справа па артыкулах за злоўжыванне службовым становішчам, якое нанесла буйны ўрон, а таксама па факце наўмыснага разгалошвання звестак, якія складаюць службовую тайну.**

**Паводле слоў Міклашэвіча, злачынствы тычыліся пытанняў закупак, паставак і рэалізацыі нафты і нафтапрадуктаў.**

**"Урон склаў не адзін мільён долараў", — сцвярджаў Міклашэвіч.**

## *Не дазволена!*

У Віцебскім гарвыканкаме не далі дазвол на правядзенне шэрагу пікетаў пад агульнай назвай „Рукі прэч ад палітычных партый!".

Мясцовыя актывісты планавалі правесці гэтыя пікеты ў перыяд з 15 лютага да 1 сакавіка. Але гарвыканкам спаслаўся на адсутнасць гарантый бяспекі падчас правядзення акцый. Заяўку на правядзенне пікетаў падаваў старшыня абласной арганізацыі Партыі БНФ Канстанцін Смолікаў. Ён паведаміў, што актывісты хацелі падтрымаць Партыю камуністаў Беларускую, якая знаходзіцца пад сталым ціскам і нават пад пагрозаю ліквідацыі.

## *Крэдыт на АЭС дадуць альбо Расія, альбо Францыя*

Беларусь разлічвае выкарыстаць для будаўніцтва АЭС крэдытныя рэсурсы. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы Віктар Марахін.

Ён адзначыў, што краіна абвесціць тэндэр на будаўніцтва атамнай электрастанцыі. "У тэндэры мяркуецца ўдзел Расіі, Францыі і, магчыма, Германіі. Прычым і Расія, і Францыя гатовыя даць крэдыты на будаўніцтва АЭС", — сказаў Віктар Марахін.

## *Беларусы падрабляюць пашпарты Еўрасаюза*

Найчасцей на беларускай мяжы затрымліваюць асоб з фальсіфікаванымі пашпартамі краін Еўрасаюза. Найбольш папулярнымі з'яўляюцца пашпарты Бельгіі, Францыі, Румыніі, Літвы і Балгарыі. Як адзначаюць у Дзяржкамітэце пагранвойскаў, выпадкі перасячэння мяжы з падробнымі пашпартамі выяўляюцца штодня.

**БЛІЦ**

## *Ці здольна ваша партыя дабіцца ад улады прынцыповай дэмакратызацыі выбарчага кодэкса ў краіне?*

**Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:**

— Гэтае пытанне не толькі да Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Гэта ёсць справа кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, якому па пашпарце споўнілася 18 гадоў і ён з'яўляецца выбаршчыкам. Гэтае пытанне да грамадзян. А якая з сітуацый ім больш патрэбна: калі ў краіне прызначаюць дэпутатаў альбо іх сапраўды выбіраюць, — пытанне іншае. Тут патрэбна шукаць адказ.

**Ігар РЫНКЕВІЧ, намеснік старшыні партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада):**

— Пачнем з таго, што ў нашай партыі ёсць спецыялісты, напрыклад, Мечыслаў Грыб, які перад гэтай уладай неаднаразова ставіў пытанне аб змяненні некаторых норм выбарчага заканадаўства. Улада гэта ігнаравала. Другая частка праблемы ў тым, што нават тое выбарчае заканадаўства, якое ў нас ёсць, у выпадку яго адкрытага і чэснага прымянення дазваляе дабіцца даволі празрыстых і транспарэнтных выбараў. Неабходна, каб у склад выбарчых камісій былі ўключаны прадстаўнікі партый, якія бяруць удзел у выбарах. Дай Бог, каб так і было.

Яшчэ адзін момант — галоўнае, каб нам дазволілі нармальна правесці агітацыю. Такая норма ў Выбарчым кодэксе таксама ўтрымліваецца. У такім выпадку мы зможам гаварыць, што выбары пройдуць чэсна.

**Аляксей ЯНУКЕВІЧ, намеснік старшыні Партыі БНФ:**

— Мы лічым, што насамрэч усё залежыць не ад таго, што напісана ў Выбарчым кодэксе, а ад таго, ці выконваюцца палажэнні, прапісаныя ў гэтым Кодэксе, ці не. І мы, безумоўна, перакананы, што мы можам дамагчыся таго, каб працаваў хаця б той Кодэкс, што ёсць зараз. Калі ён будзе выконвацца, то нават нягледзячы на тое, што там ёсць недэмакратычныя нормы, то ў нашых кандыдатаў ёсць магчымасць апярэдзіць канкурэнтаў ад іншых партый і праўладных кандыдатаў.

**Юрась БЕЛЕНЬКІ, выконваючы абавязкі старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ:**

— Пытанне пра дэмакратызацыю Выбарчага кодэкса ў краіне ёсць фальшыўка з мэтай зацягнуць выбаршчыкаў на фальшывыя выбары. Што мы і назіраем апошнія гады. У нас, мы лічым, няма такога аб'екта, як парламент, няма выбараў. А заклікаць браць удзел у тым, чаго няма, — гэта падман.

Чакаць ад улад, якія рэалізоўваюць палітыку на знішчэнне ўсяго беларускага, знішчэнне суверэнітэту... Ісці на такія выбары, якія арганізаваны гэтымі людзьмі, — гэта значыць спрыяць ім.

**Сяргей ВАЗНЯК, сябра Цэнтральнага камітэта Партыі камуністаў Беларускай:**

— Я лічу, што дэмакратычныя змяненні Выбарчага заканадаўства ў Беларусі непазбежны, паколькі аўтарытарны рэсурс кіравання вычэрпваецца. І гэта пачынаюць разумець у тым ліку і разумныя людзі ў органах дзяржаўнай улады. Яны там яшчэ ў невялікай колькасці засталіся. Таму я думаю, што гэты працэс пачне адбывацца, а наша партыя будзе актыўна гэтаму садзейнічаць.

**Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2008 г.

НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

*Семен БУКЧИН*

# Сталинщина продолжает править бал на Беларуси

Поляки всегда были у советской власти на подозрении. Ну, конечно, не все. Но для наиболее, скажем так, неприемлемых было придумано название, которого до сих пор не понимают в Польше, — "белополяки". А как еще было обозначить врагов, чтобы сразу мобилизовать классовое чутье советского человека, который должен был делить мир на белых и красных. Других цветов и оттенков не существовало. Красный — свой, белый — враг. И точка! Естественно, отсюда и "белопанская Польша", к которой тот же советский человек должен был усвоить соответствующее отношение еще в школе.

Сами-то поляки думали, что они никакие не красно- и не бело-, а просто поляки. Но это они так думали. А из-за Буга было виднее, как оно обстоит на самом деле.

Прошли годы. Кое-кому стало казаться, что "белопанские" аллюзии отошли в далекое прошлое, почти растворились. Ан нет! Не зря наш правитель много раз говорил, что мы постоянно будем обращаться к советскому опыту, поскольку там немало положительного.

Конечно, сегодня говорить о "белополяках" как-то неудобно. Мы же современные люди! А современные люди и лексику употребляют современную. Поэтому место "белополяков" теперь у нас заняла "пятая колонна". В общем-то, и этот термин уже с историей, ибо родился в 30-е годы прошлого столетия, во время гражданской войны в Испании. Тогда франкистский генерал Моло заявил, что, помимо готовящихся штурмовать республиканский Мадрид четырех армейских колонн, в его распоряжении имеется еще и "пятая колонна", которую составляют находящиеся в городе сторонники Франко. Они готовы ударить в спину республиканцам в нужную минуту... Со временем выражение "пятая колонна" стало собирательным обозначением предателей, шпионов и диверсантов, выжидающих удобного момента для открытого выступления.

И вот оказывается, что у нас, в супердемократической, экономически процветающей, поистине счастливой Беларуси, недруги готовятся сформировать именно такую "колонну". Об этой угрозе недвусмысленно заявил крупнейший белорусский интеллектуал и всемирно известный писатель Николай Чергинец. С заявлением о намерении создать "напряженность в белорусском обществе" выступило Министерство иностранных дел Беларуси. Натурально, с обличением "крапленой карты" выступила "Советская Белоруссия". Закипела дискуссия в интернете...

Но обратимся к истокам. В сентябре прошлого года в Польше был принят закон о так называемой "карте поляка". Закон предусматривает разнообразное укрепление связей поляков, живущих за рубежом, со своей как исторической, так и реальной родиной. "Карта поляка" дает право доказавшему — даже на уровне прадедушек и прабабушек — свою этническую связь с польской нацией пользоваться бесплатной многократной визой, учиться в польских вузах, заниматься бизнесом на территории Польши, иметь льготный проезд по стране. Есть и другие достаточно привлекательные привилегии... Действие "карты поляка" распространяется на 15 стран, в том числе на граждан Беларуси. Какие мотивы лежат в основе этого закона, помимо понятного гуманистического принципа, укрепляющего и облегчающего контакты людей, принадлежащих к одной национальности? Несомненен экономический аспект. Польша, как и другие европейские государства, стоит перед демографической проблемой. Работоспособное население уменьшается, чему способствует и отъезд за границу молодежи, ищущих более высокой оплаты своего труда квалифицированных специалистов, особенно усилившийся после вхождения страны в Евросоюз. Безусловно, можно говорить и о стремлении к расширению культурного влияния, пропаганды польской культуры. О последнем, кстати, заботятся многие страны, создавая свои институты за рубежом. И в Минске действуют Польский институт имени Мицкевича и Немецкий институт имени Гёте. А вот о белорусских институтах за рубежом что-то не слышно.

Но одно дело культурные центры и совсем другое — непосредственный контакт людей с землей предков. Поэтому не только Польша, но и многие другие страны приняли законы, сходные с "картой поляка", действуют такие законы, к примеру, в Германии и Венгрии, в странах Балтии. В Израиле действует "закон о возвращении", согласно которому любой, кто имеет еврейское родство, может переехать на жительство в эту страну. Российский президент Путин постоянно говорит о необходимости создания условий как для возвращения в Россию русских, оказавшихся за рубежом после развала СССР, так и о реальном укреплении связей с "русским зарубежьем". И дело не ограничивается только разговорами, российская Дума приняла соответствующие законопроекты.

Возвращаясь к Польше, следует заметить, что, укрепляя национальные связи поляков метрополии и диаспоры, польское государство помнит и о других своих гражданах, неполяках. Гораздо раньше "карты поляка" был принят закон о возвращении польского гражданства евреям, буквально вытолкнутым из страны в результате антисемитской кампании 1968 года. Что же до закона о "карте поляка", то готовился он давно, долго обсуждался в польском обществе. И в тот период белорусские власти никакого интереса к нему не проявляли. Да и с момента подписания его президентом Лехом Качиньским — а прошло несколько месяцев — тоже никакой официальной белорусской реакции не наблюдалось. И вот на днях, во время первого официального визита польского премьера Дональда Туска в Москву, белорусская власть вдруг вспомнила об этом законе и объявила его чуть ли не "вмешательством во внутренние дела Беларуси". Трудно не согласиться с некоторыми аналитиками, считающими, что момент для скандального заявления был выбран неслучайно. Как пишут на сайте Агентства финансовых новостей, "белорусские власти не вынесли дружественный тон, в котором анонсировались и прошли в Москве переговоры между главой правительства Польши Дональдом Туском и руководством России... Как известно, на протяжении нескольких лет Россия и Польша переживали в своих отношениях ледниковый период, который был на руку белорусскому режиму. В ответ на объявленное в Москве потепление в российско-польских отношениях Беларусь решила устроить международный скандал".

И вот уже пресс-секретарь белорусского МИД А.Попов заявляет, что реализация закона о "карте поляка" "способна дестабилизировать межнациональные отношения в нашей стране... породить недоверие между белорусскими гражданами различных национальностей". Анонимный автор (отсутствие подписи, безусловно, подчеркивает не частную, а государственную позицию) в "Советской Белоруссии" вздымает волну покруче и, соответственно, истеричнее: грозит призраками "баскского и корсиканского сепаратизма", "конфессиональной поножовщины в Северной Ирландии", "балканской резни", "опаснейших межнациональных трений между Румынией и Венгрией" и даже "судетской трагедии".

А как вы думали? Съездит белорусский гражданин польской национальности несколько раз по бесплатной визе в Польшу, поучится в тамошнем университете, поторгует на тамошнем рынке или поработает в какой-то польской фирме, а потом вернется к себе в Брестскую или Гродненскую область и сразу же начнет, как уверяет тот же автор "Советской Белоруссии", "проталкивать референдум о присоединении белорусских местностей к Польше".

Я понимаю мучимого этими кошмарами "советскобелорусского" автора. Сначала западные области присоединят, а потом и до Минска дело дойдет. Ведь проходила когда-то граница под Негорелым. И что же тогда будет с родной "Советской Белоруссией"?..

И все-таки, может, лучше облить голову холодной водой? Потом поглядеть на себя в зеркало. Потом принять что-нибудь успокаивающее, к психотерапевту сходить. И с внимательным дядей в белом халате в спокойной обстановке обсудить, насколько похожи белорусские поляки на испанских басков из "ЭТА" или ирландцев из "Шин Фейн". Но если очень хочется упиваться собственными страхами и биться в истерике, то тут, конечно, и психотерапевт не поможет. Дорога одна — в Новинки.

Увы — дело обстоит гораздо печальнее, нежели чье-то персональное помешательство. Читаешь заявление мидовского чиновника, знакомишься с откровениями небезызвестного генерала и анонимного автора "Крапленой карты" и невольно приходишь к мысли о том, кто же первый заговорил о возможных "межэтнических кострах" в Беларуси, кто стал размахивать этим жупелом и нагнетать провокационные настроения.

Суть подобных "страхов" в антидемократическом, авторитарном государстве лежит на ладони. Авторитаризм, как огня, боится расширения свобод, контактов людей. Ему бы все под замок, под контроль. Граждан авторитарная система рассматривает как свою собственность. Почти как рабов, разумеется, с учетом определенной модернизации. Отсюда все эти указы и законы о дающих все права только начальству контрактах на работе, о распределении студентов, о том, кто и как может выезжать за границу, лечиться и работать за рубежом, усыновлять детей, получать из-за границы деньги и т.д. и т.п. Уж, казалось, всё регламентировано, все построены. Ан нет — влезли в этот распорядок поляки со своей чертовой "картой". И что же получается? Запишутся теперь поляками не двести тысяч, как считалось у нас до сих пор, а, может быть, под миллион. Откопают черти у себя каких-нибудь польских прабабушек и прадедушек, чтобы беспрепятственно туда-сюда шнырять через границу, будут заражаться там нехорошим польским вольным духом, насмотрятся всяких свобод, узнают, какие там зарплаты и вообще условия жизни и понесут широко всю эту информацию в Беларусь.

А зачем нам эта идеологическая зараза? Это же нарушает всю нашу идеологическую работу с населением. Но ведь не скажешь же открыто, что мы боимся правды о сегодняшней польской жизни, что мы против широких контактов наших народов. Тут-то и вытаскивается на свет божий горячечный бред времен холодной войны. Про "резню" и "межэтнические костры". Пропагандисты этого бреда не замечают, что, во-первых, они выставляют белорусов завистливым и жестоким народом, способным встать на путь той же "резни" и тех же "костров" только потому, что у соседа плетень поровнее стоит. А во-вторых, возводится что-то вроде "кровавого навета" на белорусских граждан польской национальности, поскольку они априори подозреваются как затаившиеся до времени враги, точащие тайно свое оружие и ждущие подходящего момента. А как иначе, ежели, по словам все того же нашего интеллектуала и всемирно известного писателя, "карта поляка" — это "не что иное, как политический подкуп, связанный с материальными вопросами". Короче, покупают наших поляков, ну а они уж за хорошие денежки, естественно, быстренько превратятся в "пятую колонну".

И весь этот дикий, тяжелейший бред несется с самых что ни на есть государственных вершин. Оказывается, это и есть государственная мудрость — запугивать население "резней" и "межэтническими кострами". У меня не было до сих пор повода придерживаться высокого мнения об умственных способностях белорусского начальства и его идеологической обслуги, почему-то именуемой журналистами. Но, кажется, клинический показатель на сей раз зашкаливает. Впрочем, нельзя не усмотреть и в нынешней "польской истории" продолжение старого курса. Власть воевала с Союзом поляков Беларуси, разделяя последних на "хороших" и "плохих". Теперь дело пошло круче. "Пятая колонна" — это ведь те же "враги народа". А с врагами известно какой у нас разговор... Для начала, скажем, всех, получивших "карту", можно внести в списки невыездных... Как "агентов", которые, по словам автора все той же "Крапленой карты", могут вести "брутальную атаку на Беларусь". А там и другие, пожестче, меры принять можно...

Нет, не зря у нас имеется "линия Сталина". Сталинский дух продолжает править бал на Беларуси.

## *У нядзелю — да мінус 18*

**Пачынаючы з 14 лютага характар надвор'я ў нашай краіне зменіцца.**

На тэрыторыю Беларусі пачне рухацца даволі халоднае арктычнае паветра. На большай частцы пройдзе кароткачасовы снег, будуць назірацца невялікія завірухі. У чацвер тэмпература паветра на працягу сутак — 0—6 марозу. У пятніцу ўначы тэмпература паветра знізіцца да мінус 2—8 градусаў, пры праясненнях да 10 марозу, удзень — ад 0 да мінус 7 градусаў.

На выхадныя ў бок Беларусі працягне паступаць халоднае паветра з Арктыкі. У суботу ўначы чакаецца 7—13 марозу, пры праясненнях да мінус 16 градусаў, удзень — 3—9 марозу.

У нядзелю ўначы тэмпература паветра стане ўжо ад 9 да 14 марозу, месцамі да мінус 16—18 градусаў, удзень — 2—8 марозу, па ўсходзе краіны — да мінус 11 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, такое пахаладанне працягнецца нядоўга. Ужо на пачатку наступнага тыдня да нас зноў завітае паветра з Атлантыкі, якое прынясе ў Беларусь вільготнае і цёплае надвор'е.

## *Падпалілі вянкі і кветкі*

У Брэсце апаганены помнік вязням гета, размешчаны ў цэнтры горада на перакрыжаванні вуліц Дзяржынскага і Куйбышава. Як паведаміў старшыня брэсцкай яўрэйскай абшчыны Барыс Брук, вандалы спалілі вянкі і кветкі, ускладзеныя да помніка.

## *Успышка трыхінілёзу*

**На пачатку лютага ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці зарэгістравана сямейна-групавая ўспышка трыхінелёзу.**

Захварэла і шпіталізавана ў Віцебскую абласную інфекцыйную бальніцу шэсць чалавек, усе дарослыя. Як паведаміў урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя А.Ведзянькоў, крыніцай заражэння стаў дзікі кабан, адстрэлены ў другой палове снежня 2007 г. адным з захварэлых — егерам Гарадоцкага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

## *Не дарыце грошы на вяселле!*

**Суд Савецкага раёна Гомеля аштрафаваў мясцовага таксіста Кастуся Жукоўскага на 50 базавых велічынь за грашовы падарунак, які той атрымаў на вяселле.**

Ён прызнаны вінаватым ва ўхіленні ад выплачвання падаткаў. Як палічыў суд, Кастусь Жукоўскі наўмысна не задэкларава ў грошы, якія атрымаў у якасці падарунка на ўласным вяселлі ад цёткі з Украіны. Дзве тысячы долараў, якія падаравала свая чка, падаткавікі палічылі замежнай дапамогай, якая, згодна з прэзідэнцкім дэкрэтам, павінна абавязкова дэкларавацца ў падатковай інспекцыі. Цікава, што дазналіся пра гэты падарунак падаткавікі непасрэдна ад самога абвінавачанага, калі той з парады юрыста падаў сваю дэкларацыю аб прыбытках.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

# Ці знойдзе Лукашэнка час для сустрэчы?

**Неяк у "Народнай волі" я прачытала пра ініцыятыву групы жанчын, сваякі якіх несправядліва асуджаны. Яны дабіваюцца сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам і нават звярнуліся да Уладзіміра Пуціна з просьбай, каб ён пасадзейнічаў у арганізацыі такой сустрэчы. Лічу, што праблема несправядлівых судоў вельмі актуальна для Беларусі. Але ніхто не хоча брацца за яе. Таму, сапраўды, толькі на ўзроўні Аляксандра Лукашэнкі можна яе вырашыць. Але ці ёсць хоць які плён з ініцыятывы жанчын?**

**Марыя Сцяпанаўна Ульянава, Магілёўская вобласць.**

На жаль, пакуль у вырашэнні гэтай праблемы сапраўды нейкае замкнёнае кола. Звароты 32 беларускіх жанчын да Уладзіміра Пуціна з просьбай садзейнічаць у сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам з Крамля накіроўваюць у Адміністрацыю прэзідэнта Беларусі.

Нагадаем, што з 12 па 14 студзеня жанчыны (сваячкі асуджаных, а таксама не згодныя з рашэннямі судоў па сваіх грамадзянскіх справах) з Мінска, Бабруйска (Магілёўская вобласць), Барысава, Жодзіна, Маладзечна і Салігорска (Мінская вобласць), Гродна і Ліды (Гродзенская вобласць), Мазыра (Гомельская вобласць), Пастаў (Віцебская вобласць) і Пружан (Брэсцкая вобласць) накіравалі сем калектыўных тэлеграм Уладзіміру Пуціну па пытанні арганізацыі сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. На працягу некалькіх гадоў жанчыны спрабавалі дабіцца сустрэчы з кіраўніком дзяржавы, бо лічаць незаконнымі рашэнні, раней прынятыя па справах іх блізкіх, а на свае канкрэтныя пытанні атрымліваюць адпіскі ад службовых асоб суда і Генеральнай пракуратуры. 9 студзеня 2008 года жанчыны зноў звярнуліся ў Адміністрацыю прэзідэнта з просьбай аб асабістым прыёме ў А.Лукашэнкі, аднак атрымалі адмову, пасля чаго накіравалі тэлеграмы прэзідэнту Расіі, у якіх спадзяваліся *"на яго вялікія магчымасці і ўплыў на кіраўніка беларускай дзяржавы"*.

Жанчыны лічаць, што менавіта чыноўнікі Адміністрацыі прэзідэнта перашкаджаюць сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. Але зараз яны спадзяюцца, што, прыйшоўшы з поштай ад прэзідэнта Расіі, яны ўсё-такі дойдуць да Аляксандра Лукашэнкі. І ён знойдзе час для сустрэчы з тымі, хто ўжо амаль адчаяўся знайсці праўду ў сваёй краіне.

**Лілія ВОРАНАВА.**

ЗНАЁМЦЕСЯ

*Таццяна ЦІШКЕВІЧ:*

# «Свабода ў Беларусі будзе на кані»

**Пасля адной са студзеньскіх акцый пратэсту прадпрымальнікаў дзевятнаццацігадовая маладзёжная актывістка Таццяна Цішкевіч апынулася за кратамі ў спецпрыёмніку-размеркавальніку на Акрэсціна. Там дзяўчына даведалася, што ўжо не з'яўляецца студэнткай Беларускага дзяржаўнага універсітэта фізічнай культуры.**

**Хаця да таго, як Таццяну суд адправіў "на суткі", праблем з вучобай у яе не назіралася.**

— Я навучалася на другім курсе БДУФК на спецыяльнасці "трэнер па конным спорце", — *распавядае Таццяна.* — Мне з дзяцінства падабаліся коні. Самастойна даведалася, дзе можна займацца конным спортам, і шэсць гадоў ад'ездзіла на трэніроўкі ў Ратамку. Літаральна днявала і начавала там. У выніку здала нарматывы кандыдата ў майстры спорту. Выступала на спаборніцтвах, былі неблагія вынікі... Зараз працягваю займацца конным спортам у прыватных клубах. Праўда, часу на гэта не так шмат...

**— Маеш на ўвазе свой актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны, выхады на акцыі пратэсту? Дарэчы, навошта табе, маладой, прывабнай дзяўчыне спатрэбілася палітыка...**

— Да пэўнага часу ў маім жыцці акрамя спорту амаль нічога не было. Я не цікавілася падзеямі, якія адбываліся ў Беларусі, не чытала недзяржаўных газет. У дэмакратычны рух прыйшла пасля знаёмства з Мікітам Сасімам і іншымі актывістамі. Праз іх я даведалася пра знікненні апанентаў улады, пра знявагу да беларускай мовы і культуры з боку ўлады... І вось ужо больш за год я актывіст грамадзянскай кампаніі "Джынс за свабоду".

**— Таццяна, пасля адной са студзеньскіх акцый пратэсту прадпрымальнікаў ты атрымала больш за ўсіх — ажно дваццаць сутак адміністрацыйнага арышту...**

— Рана ці позна гэта павінна было здарыцца... У нашай краіне дэмакратычныя актывісты падвяргаюцца жорсткаму пераследу. Я ў гэтым сэнсе не выключэнне. Раней у мяне былі затрыманні і штрафы, а вось "на суткі" трапіла ўпершыню.

Мяне, зусім не вялікую дзяўчыну, затрымлівалі ўпяцёх. Кінулі ў аўтазак. Там збівалі. На куртцы амапаўцы пакінулі два сляды ад абутку. Калі апынулася на Акрэсціна, то зразумела, што ў мяне страсенне галаўнога мозгу — у мяне круцілася галава, мяне ванітавала...

**— "Хуткую дапамогу" табе выклікалі?**

— Выклікалі, але не адразу. Прычым, калі прыехалі ў шпіталь, міліцыянт, які мяне суправаджаў, адразу заявіў дактарам: "Яна сімулюе, у бальніцу класці яе не трэба". Так мяне і вярнулі назад на Акрэсціна. Мне яшчэ некалькі дзён было млосна. Адзіны станоўчы ва ўсёй гэтай гісторыі момант — мне абсалютна не хацелася есці. А рацыён на Акрэсціна, мякка кажучы, не вельмі...

**— Там жа, на Акрэсціна, ты даведалася, што ўжо не з'яўляешся студэнткай...**

— Так. Я не скажу, што была круглай выдатніцай, але і вялікіх "хвастоў" па вучобе ў мяне не было. Вучылася, як бальшыня спартсменаў. А адлічылі мяне на падставе нясвоечасовай аплаты за навучанне. Я не магла заплаціць у час у сувязі са сваім арыштам. Канечне, падстава па сваёй сутнасці фармальная. Зараз я падала скаргу на гэтае рашэнне рэктарату. Бо ў дамове аб платным навучанні, якую я заключыла перад паступленнем ва універсітэт, напісана, што ў выпадку нясвоечасовай аплаты за навучанне я маю права пагасіць запазычанасць з улікам пені. Вось і паглядзім, ці дадуць мне такое права.

**— Таня, ведаю, што з-за тваёй актыўнай грамадзянскай пазіцыі дома ў цябе вялікія праблемы...**

— Гэта для мяне балючая тэма... Я, калі размаўляю са сваімі бацькамі, вельмі добра ўяўляю галоўную праблему беларускай апазіцыі. Апазіцыйныя лідэры не могуць пераламіць самасвядомасць людзей, не могуць дайсці да іх. Сказаць, што мае мама і тата, якіх я вельмі люблю, негатыўна ставяцца да маёй дзейнасці ў грамадскай кампаніі "Джынс за свабоду", гэта значыць нічога не сказаць. Яны рэгулярна глядзяць Беларускае тэлебачанне, а таму ўпэўнены, што мяне выкарыстоўваюць у нейкіх брудных гульнях, а сама я, нічога не разумеючы, паддалася чужому ўплыву...

**— Спрабуеш тлумачыць, што гэта не так...**

— Спрабую на канкрэтных прыкладах. Яскравы прыклад — закон аб адмене льгот, які закрануў значную частку нашага насельніцтва. Мае бацькі працуюць на дзяржаўных прадпрыемствах, і іх гэтая праблема не закранула, але прыняты нашымі ўладамі закон закрануў іхніх бацькоў. Яны быццам бы і згаджаюцца, але потым усё роўна вяртаюцца да таго, што мяне выкарыстоўваюць і адна я нічога не змяню...

**— Дык можа, прасцей усё кінуць, засяродзіцца на спартыўнай кар'еры, аднавіцца на вучобе, забыцца пра акцыі пратэсту, штрафы і арышты?..**

— Канечне, прасцей. Але я вельмі ўпартая, як многія спартсмены. Я не прывыкла збочваць з абранага шляху і прайду яго да канца, чаго б мне гэта ні каштавала. Няма нічога прасцей, чым займацца любімай справай і быць абыякавай да таго, што адбываецца навокал. Я не такая. Як бы гэта пафасна ні прагучала, але мне баліць і чужы боль. І я ведаю, што не толькі мне. Нас шмат.

Па сваёй натуры я рамантык, таму веру ў тое, што свабода ў Беларусі будзе на кані.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

ПА ЧУТКАХ І...

## *Прыглядзеў ці праглядзеў?*

**З хуткасцю гука па Беларусі пачала распаўсюджвацца інфармацыя, што адзін з самых буйных сусветных дыямантэраў (гандляроў брыльянтамі) мае намер прыватызаваць або набыць на ўмовах канцэсіі гомельскае прадпрыемства "Крышталь". Магчыма, чуткі былі выкліканы тым, што нават афіцыйны сайт прэзідэнта Беларусі інфармаваў, што ў лістападзе мінулага года на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам адзін з найбагацейшых людзей Ізраіля Леў Ляваеў выказаў зацікаўленасць ва ўваходжанні свайго капіталу ў ювелірную галіну беларускай эканомікі.**

Аднак кіраўніцтва рэспубліканскага алмазаапрацоўчага унітарнага прадпрыемства "Гомельскае вытворчае аб'яднанне "Крышталь" абвергла інфармацыю аб прыватызацыі прадпрыемства ізраільскім дыямантэрам. Як паведаміў генеральны дырэктар прадпрыемства "Крышталь" Анатоль Голісеў, РУП "Крышталь" не цікавіць Льва Ляваева. *"Тым больш "Крышталь" набыць немагчыма, бо гэта унітарнае дзяржаўнае прадпрыемства, рэспубліканская ўласнасць"*, — падкрэсліў гендырэктар.

Тлумачачы прычыны адсутнасці ў сусветнага дыямантэра цікавасці да гомельскага прадпрыемства, А.Голісеў зазначыў, што прадпрыемствы па агранцы Ляваева ў Маскве і Пермскай вобласці (Расія) загружаны алмазнай сыравінай прыкладна на 50—60%. *"Таму для спадара Ляваева на сённяшні дзень больш важнай задачай з'яўляецца доступ да сыравіны, для таго каб загрузіць свае прадпрыемствы на 100% і забяспечыць эфектыўную працу магутнасцяў. Набываць у такой сітуацыі дадатковыя магутнасці, што не будуць забяспечаны сыравінай, проста няправільна. Леў Ляваеў проста хацеў выкупіць поўнасцю, сто працэнтаў акцый "Белювеліргандлю", яму ў гэтым адмовілі. Сістэма "Белювеліргандлю" на сённяшні дзень з'яўляецца дзяржаўным унітарным прадпрыемствам, таму каб прадаць, гэта прадпрыемства трэба акцыянаваць, а пасля ўжо прадаваць акцыі. Дзяржава не пайшла на акцыянаванне "Белювеліргандлю", як і не пайшла на продаж"*, — пракаментаваў А.Голісеў.

Таксама гендырэктар зазначыў, што на прадпрыемства "Крышталь" канкрэтных прапаноў ад Льва Ляваева не паступала. *"Прыватызацыя або набыццё гомельскага "Крышталя" не адпавядае інтарэсам бізнесу Ляваева на найбліжэйшыя пяць гадоў"*, — лічыць суразмоўца.

**Да ведама.** Леў Ляваеў — адзін з самых буйных дыямантэраў у свеце. Абарот LGC ("Група кампаній Ляваева") дасягае 3 млрд долараў, з якіх больш за 1 млрд прыходзіцца на алмазны бізнес.

**Алена ГЕРМАНОВІЧ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2008 г.

# Где и у кого еще взять деньги?

**Похоже, этот вопрос не дает покоя белорусским властям. Когда читаешь новости в СМИ, складывается впечатление, что в стране катастрофически не хватает денег, чиновники то и дело выискивают любые способы пополнить казну. Вот только несколько сообщений последних дней.**

Как сообщил на заседании коллегии Минфина заместитель министра Иван Шунько, Минфин инициирует совместное с Министерством транспорта и коммуникаций изучение опыта соседних стран, в частности, Польши и России, чтобы внести конкретные предложения по взиманию платы за пользование дорогами. По словам И.Шунько, платить должны как зарубежные, так и отечественные перевозчики, чтобы "не было нареканий", что отечественным "отдается приоритет".

**Многодетной семье с доходами около 100 тысяч рублей на каждого отказали в получении адресной помощи, хотя на такую помощь вправе рассчитывать каждый, чьи доходы ниже 185.670 рублей.**

**"Мой муж пошел в исполком подавать документы на получение адресной помощи. В паспорте увидели штамп, который ставят при выезде в Украину. И сказали: раз вы были за границей, значит, ничего вам не полагается. Через год приходите…"**

Президент Беларуси 28 января подписал указ №50 "О мерах по упорядочению деятельности садоводческих товариществ". Ранее созданные садоводческие товарищества обязаны привести свои учредительные документы в соответствие с требованиями указа в течение года после вступления этого нормативного акта в силу.

Понятно, что не бесплатно.

**В Беларуси изменен порядок уплаты акцизов при ввозе товаров из России. Принятие этого нормативного акта призвано устранить несоответствие отдельных правовых норм, а также обеспечить дополнительные поступления денежных средств в бюджет страны, отмечается в комментарии пресс-службы главы государства.**

Повысив стоимость транзита нефти по белорусской территории, правительство теперь думает поднять плату и за прокачку нефтепродуктов. О том, что такая возможность сейчас обсуждается во властных кругах, сообщил ПРАЙМ-ТАСС представитель органов госуправления, раскрыв ориентировочный размах повышения — 30%. По расчетам белорусского правительства, новые тарифы дополнительно принесут бюджету около 31 млн долларов...

**В Беларуси с 1 января 2008 года установлены новые цены на природный и сжиженный газ для населения. Они утверждены постановлением Совета министров №69 от 18 января 2008 года, сообщил БелаПАН со ссылкой на пресс-службу правительства.**

В 2008 году Беларусь планирует привлечь 1,2 трлн рублей внешних ресурсов для финансирования дефицита бюджета. Об этом сообщил министр финансов Николай Корбут на заседании коллегии Министерства финансов. "Это минимальный уровень потребности во внешних источниках для финансирования планируемых мероприятий бюджета", - подчеркнул он и поручил должностным лицам Минфина "активнее работать над решением этой проблемы".

**Министр финансов Николай Корбут подтвердил заинтересованность Беларуси в привлечении нового российского стабилизационного кредита.**

Минтранс Беларуси предлагает форсировать принятие документа, вносящего изменения в систему установления платы за обучение в автошколах. Об этом на заседании коллегии Министерства транспорта и коммуникаций сообщил министр Владимир Сосновский.

**МНС Беларуси выступает за увеличение налоговой нагрузки на банки и страховщиков.**

Министерство торговли положительно относится к инициативе Министерства сельского хозяйства и продовольствия поднять закупочные и розничные цены на молочную и мясную продукцию. Об этом министр торговли Александр Иванков заявил на пресс-конференции в Минске.

*Как видим, появление все новых видов платежей, рост тарифов и цен, отмена льгот, привлечение инвесторов и ресурсов... Такие новости становятся постоянными и главными.*

**Андрей РУСАКОВИЧ.**

## *«Энергетычныя» карупцыянеры*

**У 2007 годзе ў падведамасных Міністэрству энергетыкі Беларусі арганізацыях было выяўлена 17 карупцыйных злачынстваў, у 2006-м — 27. Такую інфармацыю паводле вынікаў праверкі выканання міністэрствам патрабаванняў антыкарупцыйнага заканадаўства абнародавала Генеральная пракуратура.**

Паведамляецца, што ў 2007 годзе за атрыманне хабару асуджаны дырэктар ААТ "Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый", дырэктар і намеснік дырэктара філіяла "Кіраванне будаўніцтвам Мінскай ЦЭЦ-5" ААТ "Белэнергабуд". Пры праверцы распачаты крымінальныя справы карупцыйнай скіраванасці ў дачыненні да генеральнага дырэктара РУП "Мінгаз" і яго намесніка.

Праверка выявіла, што з парушэннем патрабаванняў закона аб барацьбе з карупцыяй план мерапрыемстваў па супрацьдзеянні гэтай з'яве на 2007 год і наступныя гады Мінэнерга быў зацверджаны толькі ў лістападзе мінулага года, аб'яднаннямі "Белэнерга" і "Белпалівагаз" адпаведныя планы не распрацаваны. Устаноўлена, што створаная ў Мінэнерга ў 2005 годзе камісія па кантролі за выкананнем антыкарупцыйных мерапрыемстваў не функцыянуе больш чым год, і каардынацыю працы падведамасных арганізацый па супрацьдзеянні карупцыі яна не забяспечвае. Палажэнне аб камісіі распрацавана толькі падчас праверкі.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ.**

**МЕРКАВАННЕ**

## *На якіх умовах Расія дае крэдыты?*

**Беларусь зацікаўлена ў прыцягненні чарговага расійскага крэдыту на два мільярды долараў. Пра гэта заявіў першы намеснік міністра фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец, паведамляе Радыё Свабода.**

Ён адзначае, што расійскі дзяржкрэдыт на 1,5 мільярда долараў, атрыманы ў снежні 2007 г., быў дадзены на вельмі выгадных умовах.

Эксперт аналітычнага цэнтра "Стратэгія" Яраслаў Раманчук лічыць, што беларускае Міністэрства фінансаў становіцца асноўным лабістам інтарэсаў расійскага буйнога капіталу.

*"Замест таго каб наводзіць парадак у сваіх фінансах, яны ідуць лёгкім шляхам павелічэння запазычанасці. Пазіцыя Расіі заключаецца ў тым, каб тут нічога не рабілі, і потым нашы найлепшыя актывы можна будзе забраць за мінімальную цану. А беларускі ўрад, замест таго каб думаць стратэгічна, думае ў межах пяцігодкі і вызначанага плана. Але менавіта выкананне гэтага плана пры дапамозе знешніх крэдытаў і з'яўляецца той пасткай, у якую мы ўсе разам патрапім",* — лічыць Яраслаў Раманчук.

Эканаміст Аляксандр Патупа таксама звяртае ўвагу на тое, што Расія крэдытуе Беларусь з пэўнымі ўмовамі.

*"Адна з умоў — як Беларусь ставіцца да расійскіх інвестараў. Спярша значная частка расійскіх інвестараў прыходзіць у Беларусь, і ім ствараюцца пэўныя ўмовы. Тады і расійскі крэдыт даецца.*

*Пытанне пра расійскі крэдыт — гэта пытанне, у якім кірунку ён пойдзе. Калі гэта будзе проста кампенсатар выдаткаў на энерганосьбіты, то гэта называецца — праядаць грошы. Раз так, другі, і мы будзем мець вельмі вялікія пазыкі. А для таго каб усур'ёз стымуляваць інвестыцыйны працэс, трэба мець іншую эканамічную мадэль..."* — мяркуе Аляксандр Патупа.

# Второй акт приватизационного балета

*Государственный комитет по имуществу подготовил предложения по акционированию госпредприятий и возможным продажам пакетов их акций в 2008 году.*

Как сообщила БЕЛТА директор фонда государственного имущества Госкомимущества Наталья Жерносек, *"примерно к концу февраля мы будем иметь конкретные перечни организаций, находящихся в госсобственности и подлежащих преобразованию в ОАО, а также открытых акционерных обществ, акции которых планируются для продажи по конкурсу или на аукционе в 2008 году".*

Иными словами, государство возобновило работу, которую панически начало (а после — затормозило) сразу после радикального повышения цен на российские энергоносители. В спешно подготовленном тогда белорусским правительством документе скорой продаже подлежали госдоли практически во всех ключевых заводах страны.

Как выяснилось позже, разработка столь обширной приватизационной программы была первой оторопью перед новой нефтегазовой действительностью. Причем, по мнению экспертов, вызвана она была не столько повышением цен на энергоносители, сколько несостоятельностью самой модели белорусской экономики — ее сверхзатратностью.

В феврале 2007-го в интервью агентству Рейтер Александр Лукашенко говорил: *"Я думаю, что найдутся желающие компании, которые поставят в Беларусь нефть, с которыми мы приватизируем и акционируем наши нефтеперерабатывающие предприятия".* Но уже в апреле президент уточнил, что обвальной приватизации не будет: *"Мы четко определились: у нас не будет обвальной приватизации, пока я президент. Она будет точечной. ... В Беларуси будут приватизироваться те предприятия, с которыми мы не справляемся".*

Видимо, государство решило-таки начать сбрасывать с себя неэффективные активы, дав чиновникам соблазн сделать под этой маркой как можно больше предприятий "убыточными". Тем более что спрос на белорусские активы у внешних инвесторов есть. Переговоры с ними сейчас активно ведутся в пищевой промышленности, банковской сфере, стратегические инвесторы приходят в сектор телекоммуникаций.

Стратегические инвесторы идут, причем они готовы давать неплохие цены за белорусские предприятия. Основной вопрос при их привлечении, считает глава инвестиционной компании, упрется в нежелание государства выпустить из своих рук контрольные пакеты акций. По мнению директора инвестиционной группы "Юнитер" Андрея Дерехa, *"для белорусской стороны проблема в том, что контроль над предприятием, который хотелось бы оставить за собой, придется передать инвестору".*

Легче расставаться с неэффективными предприятиями, которые станут передавать инвестору со списком социальных условий. В начале года более 17% промышленных предприятий страны были убыточны. Максимальная их доля пришлась на систему Минсельхозпрода — 37,6% (73 предприятия), легкую промышленность — 27,4% (26) и лесобумажную — 25,8% (17). Минимальная — на концерн "Белнефтехим".

Что касается высоколиквидных компаний и тех, которые имеют для страны стратегическое значение, в этих случаях, считает А.Дерех, необходимо принимать *"специальные решения и относиться к этому очень взвешенно".*

Нельзя забывать и о национальной особенности оценки активов: *"Предложение для инвестора должно показывать убедительность стоимости бизнеса,* — подчеркивает глава инвестиционной группы. — *Финансовая отчетность и прозрачность — основной критерий для прихода инвесторов. К сожалению, в Беларуси обычная практика: "Давайте умножим в 10 раз и предложим". Кроме удивления и последующего срыва переговоров, это ничего не вызывает. Оценка должна быть понятной, четкой и исходить из состояния рынка, странового рейтинга, доходности предприятия".*

Раскрывая как-то украинским журналистам секреты успехов белорусской экономики, президент в качестве примера отказа от тотальной приватизации привел бобруйскую "Белшину", за которую, по его словам, еще пять лет назад инвесторы предлагали 40 млн долларов, однако получили отказ, а сегодня стоимость предприятия — уже около 1,2 млрд долларов. *"Но мы не собираемся его и сейчас продавать",* — добавил Лукашенко.

Не надо бояться отдавать рычаги управления инвесторам, поскольку у государства в Беларуси достаточно опосредованных рычагов контроля над исполнением инвестиционных обязательств, убежден эксперт "Белорусских новостей" Андрей Дерех.

По его мнению, Беларусь как страна с малой открытой экономикой не может иметь иной перспективы, кроме привлечения стратегических инвесторов. И те предприятия, куда они придут, будут интегрированы в развитые мировые сети. Наименьшие проблемы в этом смысле, считает он, у банковского сектора, который уже открыт, и в нем активно идет движение по сделкам слияний и поглощений.

Хотя сегодня, обращает внимание эксперт, у нас в законодательстве масса нестыковок даже в том, что касается привлечения близких российских инвесторов. Комитет по ценным бумагам при Совмине, по его сведениям, в настоящее время работает над огромной массой вопросов, но до готового продукта, на основании которого можно было бы говорить, что белорусские предприятия могут выходить на международные рынки капитала, еще далеко.

Говоря сегодня о распределении акций преобразующихся в ОАО госпредприятий, глава фонда Госкомимущества Наталья Жерносек отметила, что работники при акционировании, как правило, собственниками предприятия не становятся, потому что приобретают около 2—3% акций, что *"не дает им больших прав. Собственником остается государство, владеющее контрольным пакетом акций. Именно государство и несет на себе груз финансового оздоровления этого предприятия".*

На недавно акционированной Гродненской табачной фабрике "Неман", также попавшей в прошлом году в фигуранты реформаторского списка, груз финансового оздоровления по большей части несет компания "Бритиш Американ Тобакко", что не помешало государству оставить предприятие у себя (99,6% акций). Работникам досталось лишь 0,4% фабричных активов.

Чаще всего, говорит Н.Жерносек, трудовой коллектив выступает собственником небольших предприятий — сферы услуг, общепита, где для развития не требуется значительных вложений. А там, где есть промышленное производство, требующее больших инвестиционных затрат, *"нужно говорить об эффективном собственнике, владеющем достаточными финансовыми и трудовыми ресурсами, рынками сбыта".*

*"Собственник — это человек, который не только желает, но и может быть им",* — подвела она черту.

**Елена НОВОЖИЛОВА.**
*Белорусские новости.*

## *Спыніце цэны*

**Кажуць, няма нічога больш пастаяннага, чым часовае. Пацвярджаюць гэта многія факты з нашага жыцця. Напрыклад, ужо паўтара дзесятка гадоў улады сцвярджаюць, што вось-вось настане росквіт і народ пачне жыць заможна, так, як жывуць людзі ў цывілізаваных краінах.**

Але пакуль самы стабільны паказчык — рост цэн на прадукты і тавары. У маі мінулага года ў газеце быў надрукаваны мой допіс "Тады і цяпер" з табліцай коштаў некаторых асноўных прадуктаў харчавання. Прапаную яе яшчэ раз, але з дабаўкай слупка цэн у студзені гэтага года (**кошт у рублях за кілаграм**).

Рост цэн за апошнія паўтара дзесятка гадоў так "стабілізаваўся", што ўжо не выклікае ў людзей здзіўлення. Даражэе то хлеб, булкі, пячэнне, то малако і вырабы з яго, то рыбныя прадукты, то садавіна... Цэннікі мяняюцца і мяняюцца.

| Назва прадукту | Цана ў чэрвені 2004 г. | У маі 2007 г. | У студзені 2008 г. |
|---|---|---|---|
| Свініна | 4950 | 7490 | 8130 |
| Ялавічына | 5220 | 7640 | 8240 |
| Сала салёнае | 4710 | 6500 | да 11.900 |
| Каўбаса "Доктарская" | 5600 | 9140 | 11.600 |
| Сыр "Расійскі" | 7040 | 9630 | 13.130 |
| Сыр "Каўбасны" | 4800 | 8150 | 10.060 |
| Малако, літр | 570 | 900–1000 | 1120–1460 |
| Смятана, слоік | 750 | 1100 | 1460 |
| Яйкі, Д-2, дзесятак | 1500 | 2010 | 2340 |

Уражваюць тэмпы росту цэн. Тая ж "Доктарская" за тры гады вырасла ў цане (з 2004-га да 2007 г.) на 3540 рублёў, а за нейкія паўгода (з мая 2007-га да студзеня 2008-га)... на 2460. Сыр "Расійскі" падаражэў адпаведна на 2590 і 3500, а сала на 2120 і аж больш як на 5000 рублёў. За 3,5 года рост у 2 альбо амаль у 2 разы.

Словам, у народа скрадзены яго ўклады ў ашчадныя касы — гэта велізарныя грошы. Народ абрабаваны сярод белага дня. Вінаватыя не пакараны. Абяцанні вярнуць грошы не выкананы.

Цэны растуць, зарплата за імі не паспявае, інфляцыя не спыняецца. У выніку народ бяднее, абкрадваецца, яго дабрабыт зніжаецца. Гэта таксама на юрыдычнай мове мае назву.

На пытанне, чаму такое творыцца беспакарана, ніхто не адказвае. Што, ў Беларусі няма пракуратуры, іншых праваахоўных органаў, якія павінны стаяць на ахове інтарэсаў народа?

**Мікалай ДЗЕЛЯНКОЎСКІ, пенсіянер.**
*Мінск.*

# Очередное «экономическое чудо»

**Беларусь являет миру очередное "экономическое чудо" — убыточную торговлю. Каждое десятое предприятие торговли страны работает с минусом.**

Одна из серьезных проблем — отсутствие оборотных средств почти у половины торговых предприятий, сообщил журналистам министр торговли Александр Иванков. "По оперативным данным, 46% предприятий торговли не имеют собственных оборотных средств — закредитованы в банках. Перейти на самоокупаемость и на расширенное воспроизводство, не имея собственных оборотных средств, невозможно. Средняя торговая наценка составляет 19%. Рентабельность торговых предприятий в среднем составляет 2,5%. Каждое десятое предприятий торговли убыточно", — приводит ПРАЙМ-ТАСС слова министра.

**ПА ВАШАЙ ПРОСЬБЕ**

## *Колькі каштуе так званая саюзная дзяржава*

**Паважаная "Народная воля"! Колькі сродкаў траціцца на ўтрыманне так званай саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, розных структур СНД? Ёсць жа ў "саюзнай дзяржаве" і бюджэт і пастаянны камітэт. Іх чыноўнікі атрымліваюць, напэўна, не малыя грошы.**

**Тамара Белая, г.Мінск.**

У дадатку 5 да Закона "Аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на 2008 год" сказана, што пастаяннаму Камітэту Саюзнай дзяржавы выдзелена 122.348.100 тысяч рублёў. Нямала траціцца і на ўтрыманне структур СНД і іншых утварэнняў на прасторах былога СССР.

| Каму? | Колькі? У тыс.руб. |
|---|---|
| Выканаўчы камітэт СНД | 1.722.000 |
| Савет Міжпарламенцкай Асамблеі СНД | 1.052.985 |
| Міждзяржаўны авіяцыйны камітэт | 57.687 |
| Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы | 1.158.535 |
| Інтэграцыйны камітэт Еўразійскай эканамічнай супольнасці | 3.304.407 |
| Камісія Адзінай эканамічнай прасторы | 447.315 |
| Сакратарыят Каардынацыйнага савета генеральных пракураў дзяржаў-удзельнікаў СНД | 21.619 |
| Каардынацыйны камітэт па пытаннях супрацьпаветранай абароны СНД | 17.220 |

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2008 г.

Я — ПРАПАНУЮ!

# Агульнанацыянальны дыктант як святкаванне 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі

Некалькі дзён таму меў размову з ветэранам апазіцыйнага руху, якому ўжо 75 год. Шмат пра што пагаманілі, а калі пайшла гаворка пра маючае адбыцца шэсце і мітынг на 90-годдзе БНР, ён сумна зазначыў: "Гады не тыя, каб хадзіць ды з міліцыянтамі біцца. Ногі баляць, ледзь да крамы даходжу, сэрца тахкае..." А я падумаў, што ад удару дручком міліцыянта-бамбізы гэты хрупкі дзядок можа і памерці. Жонка ягоная ўжо сышла з гэтага жыцця. Вось і атрымліваецца, што свята для яго разам с аднадумцамі можа і не атрымацца.

Пасля той размовы даведаўся, што літоўцы ў трэці раз 26 студзеня правялі па ўсім свеце агульнанацыянальны дыктант. Прычым шмат каму знаёмы з беларусаў міністр замежных спраў Літвы Пятрас Вайтэкунас пісаў дыктоўку ў Германіі разам з кіраўнікамі літоўскіх меншасцяў у краінах Еўрасаюза, дзе яны ладзілі сустрэчу. Пісалі і беларускія літоўцы ў амбасадзе Літвы ў Мінску... Пісалі, каб мацаваць павагу да роднай мовы, каб яна развівалася. І гэта была грамадская акцыя ў еўрапейскай краіне, дзе дзяржаўнасць мовы гарантуе яе неўміручасць! Дарэчы, пераможцы конкурсу дыктовак робяцца на пэўны час нацыянальнымі героямі Літвы.

Я падумаў: а чаму б і нам, беларусам, 25 сакавіка за некалькі гадзін да шэсця не напісаць разам агульнанацыянальны дыктант? Уявіце, як гадзін у 10 раніцы паўсюль, дзе толькі магчыма (ва ўправе Партыі БНФ, у офісах іншых партый, у Таварыстве беларускай мовы — селі партыйныя і грамадскія лідэры разам з шараговымі сябрамі рухаў і партый. Выбітныя пісьменнікі, гісторыкі, навукоўцы селі поруч са сваімі чытачамі і разам пад дыктоўку напісалі свой дыктант на тэму "Чаму і як я святкую 90-годдзе БНР". Дыктуе аўтар тэксту па Радыё Свабода. Папярэдне ролік з тэкстам дыктанта запісваецца на відэастужкі і дыскі, выстаўляецца ў інтэрнеце, але без напісання складаных слоў і спрэчных знакаў прыпынку. А пасля на мітынгу удзельнікам раздаецца правільны тэкст. Камісія абвяшчае пераможцаў. Поўныя тэксты друкуюцца ў "Народнай волі", "Нашай Ніве".

Сама акцыя сумеснага напісання дыктанта ва ўсіх куточках Беларусі і за яе межамі можа стаць сусветнай дэманстрацыяй салідарнасці беларусаў з роднай мовай і адзін з адным.

Мне могуць запярэчыць, што за некалькі гадзін немажліва напісаць і праверыць тэкст. Што шмат хто засаромеецца браць удзел і здаваць тэкст, каб не атрымаць адмоўную адзнаку.

І гэта правільныя пярэчанні. І здымаюцца яны проста. Па-першае, дыктоўку можна пачаць пісаць і за тыдзень да 25 сакавіка. Але 25-га лідэры мусяць сесці разам і прадэманстраваць, што яны пішуць, як вучні ў школе жыцця.

Па-другое, ніхто не будзе прымушаць здаваць тэкст, здача толькі для жадаючых праверыць свае веды. Кожны можа забраць дыктоўку ў свой уласны архіў, праверыць сам сябе па матрыцы і потым паказваць дзецям і ўнукам тэкст першай агульнанацыянальнай дыктоўкі.

Спытаеце: хто напіша кананічны тэкст дыктанта?

Нашы пісьменнікі і паэты здольныя гэта зрабіць. Тэкст можа быць з дзвюх частак: верша і празаічнага твора, накшталт тэкста Арлова "Незалежнасць — гэта..."

Урэшце, у СМІ трэба надрукаваць усе прапановы дыктовак, з якіх можна потым скласці кнігу аб першым агульнанацыянальным дыктанце, праектах тэкстаў, пераможцах. Хай нашчадкі пачытаюць, параўнаюць.

Чым узнагародзіць пераможцаў? Па-першае, самая галоўная ўзнагарода — прызнанне пераможцам у першым агульнанацыянальным конкурсе дыктанта. Вынікі і пераможцаў можна выяўляць у розных "вагавых" катэгорыях. Па-другое, бясплатная падпіска на ""Народную волю", "Нашу Ніву", кнігі паэтаў і пісьменнікаў з іх подпісам і зычэннем. Па-трэцяе, камітэт "Звона волі", дзе сустаршынямі Марачкін і Шатэрнік, узнагароджваюць копіяй "Звона волі", які стаў сімвалам беларускага супраціву, які быў зняволены міліцыянтамі і ўрэшце вызвалены і не перапалаўлены... Марачкін ужо падтрымаў гэтую ідэю.

Асобная тэма — звароты да прадстаўнікоў улады ўзяць удзел у агульнанацыянальным дыктанце. Год таму было неверагодным прадбачыць, што яны з 25 сакавіка будуць гнаць хвалю акцый пад лозунгам "За незалежную Беларусь". Гэта вынік настойлівай працы актывістаў апазіцыі. Наўрад ці адразу яны далучацца да дыктанта апазіцыі. Але з цягам часу хай самі ладзяць нешта падобнае. Калі беларусы па ўсім свеце будуць пісаць у адзін дзень, ладзячы дэманстрацыю шанавання роднай мовы, то ніякая прапаганда не зможа ні замаўчаць, ні збэсціць салідарнасць з культурай, з традыцыямі.

Дарэчы, ідэя агульнанацыянальнага дыктанта находзіць станоўчы водгук у нашых уплывовых замежных сяброў. Яны гатовы аказаць дапамогу з памяшканнямі ў краінах Еўрасаюза для напісання тэксту нашымі землякамі. Тут "Бацькаўшчына" магла б таксама парупіцца. Праца мусіць быць супольнай. Сябры Рады БНР таксама могуць стаць прыкладам у дэманстрацыі салідарнасці.

90-годдзе БНР дае вельмі добрую нагоду закласці падмурак новай традыцыі. І тады мой знаёмы, якому ўжо 75 год, і другія людзі сталага веку, якім цяжка хадзіць на шэсці і стаяць на мітынгу, а таксама малыя, якіх бацькі баяцца выводзіць пад дручкі міліцыянтаў, змогуць вывесці іх на дэманстрацыю за парту ў гонар слыннай даты. І будучы змагар за Незалежнасць з гонарам будзе помніць і распавядаць сябрам, як не проста пісаў дыктоўку, а пісаў разам з беларусамі ўсяго свету, мацуючы тым самым і баронячы мову і волю, і іхнюю будучыню.

З павагаю —

**Уладзімір ПАДГОЛ,**
**палітолаг.**

НЕ МАГУ МАЎЧАЦЬ!

## *«Навошта ж грошы марнаваць?»*

Я працую ў гасцініцы "Кастрычніцкая" Кіраўніцтва справамі прэзідэнта. Пенсіянерка, таму з работы магу вылецець на раз, і па гэтай прычыне падпісвацца пад лістом не буду. Але і маўчаць не магу.

Не так даўно была агучана інфармацыя, што гасцініцу збіраюцца знесці, каб пабудаваць на яе месцы новую. І, надзіва, адразу пасля гэтага ў нас пачаліся рамонтныя работы: абсталявалі ў холе бар, закупілі мэблю, зрабілі дарагі рамонт у адным з залаў рэстарана. Навошта ж марнаваць дзяржаўныя грошы, калі ўсё ідзе пад знос?

**Без подпісу.**

АД РЭДАКЦЫІ

*Адказу на пытанне нашай чытачкі ў нас пакуль няма. Але наш карэспандэнт наведаў гасцініцу і на свае вочы пабачыў і новы бар, і рамонт, і мэблю. "Народная воля" яшчэ вернецца да гэтай тэмы.*

КАЛІ Б Я БЫЎ ПРЭЗІДЭНТАМ...

## *У першую чаргу правёў бы новыя выбары ў парламент*

Калі б я стаў прэзідэнтам, то ў першую чаргу правёў бы новыя выбары ў парламент. Выбарчы закон прыняў такі, як ва Украіне альбо ў Грузіі. Адмяніў бы ўсе ўказы, якія, як паказала жыццё, не прыносяць карысці.

Усе грошы, якія некалі ляснуліся на банкаўскіх рахунках, вярнуў бы людзям у бліжэйшыя 3—4 гады. У першую чаргу выплату пачаў бы з тых, каму ўжо за 70 гадоў. Грошы памерлых аддаў бы іх дзецям. Неабходныя сумы знайсці не так ужо і цяжка.

Скараціў бы на 100 працэнтаў АМАП, іншыя спецпадраздзяленні, армію. Пакінуў бы толькі 100—200 прыгожых хлопцаў для сустрэчы прэзідэнтаў іншых краін.

З першых дзён свайго прэзідэнцтва запрасіў бы спецыялістаў-рыначнікаў з-за мяжы, каб на працягу 2—3 гадоў уся эканоміка перайшла на рынкавую аснову. Малому бізнесу даў бы зялёнае святло, няхай людзі зарабляюць свае мільёны. Акрамя гэтага, дабіўся б, каб Рэспубліка Беларусь уступіла ў Еўрасаюз і НАТО.

З усімі краінамі свету праводзіў бы дружалюбную палітыку. Увесь гандаль павінен весціся толькі на ўзаемавыгаднай аснове. Усе дагаворы аб стварэнні нейкай саюзнай дзяржавы выцягнуў бы на свет божы, каб народ ведаў, чаго хацеў былы прэзідэнт. Адначасова падключыў бы спецыялістаў, каб раскрылі справы аб знікненнях Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага і даведаліся, хто справакаваў смерць Генадзя Карпенкі.

**Анастас Лявонцьевіч СЕМЯНОВІЧ,**
**жыхар пас.Бараўляны Мінскага раёна.**

ДИСКУССИЯ

# Знает ли Новиков, что...

В статье "Еще раз о военных пенсиях..." ("НВ" 10.01.08 г.) Павел Новиков утверждает, что военные люди служат, а гражданские работают. И что "гражданские люди отвечают только за самих себя, за свою работу: выключил станок, шагнул за проходную и...".

Знает ли уважаемый полковник, что такое наш советский колхоз (совхоз). Как он считает? Специалисты совхоза: главный инженер, главный агроном, главный зоотехник, учителя, врачи — чувствуют (чувствовали) ли они себя дома в отрыве от производства? Вольны ли они выбирать себе начальника, место жительства?!

Свободен ли был зоотехник 24 часа в сутки, когда наступал растел скота? Как себя чувствовал дома тот же главный инженер в разгар уборки, когда в деревне самая пьянь — это механизаторы? И никто не платил им больших зарплат, не давал денежных компенсаций и отгулов. Как никто им не предлагал и не предлагает уйти на пенсию в 45 лет, и получают они свою пенсию в 200—350 тысяч рублей, как и все цивильные.

Об опасности и ответственности на производстве. Был ли когда-нибудь уважаемый П.Новиков в литейном, кузнечном, прессовом цехах большого завода? Знает ли он, какая высокая загрязненность в том же литейном цехе, какая сплошная там загазованность, запыленность? Какой смрад жженой формовочной земли стоит даже в закрытых помещениях?

Многие ли знают, в каких условиях работают кузнецы, когда температура в печи больше тысячи градусов, а заготовок - 200—900 градусов? И что летом жарко в цеху, а зимой — холодно. Причем лицо жжет, а спина мерзнет — у крайних молотов. Почему холодно? Отвечу. Потому что сумасшедшие сквозняки от побитых стекол в окнах. Почему побиты стекла? Потому что побили их сами рабочие. Побили летом, чтоб было прохладнее. А к зиме их никогда не успевают застеклить. Вот так и вертятся, как черти, эти белые негры.

Не все, конечно, догадываются, что благодаря этому "букету прелестей" там значительную часть рабочих составляют бывшие зеки. А это джигиты еще те. Разбить стекло, запустить в мастера болванкой им как раз плюнуть.

А сейчас представьте себе на месте тех же мастеров, технологов, начальников цеха. Не на день, не на месяц, а на годы! То-то!

И никто им лихих денег не платил! Никто в 45 лет на пенсию не уходил. И получают они свои 300-400 тысяч рублей пенсии, как и все цивильные.

А опасна ли работа журналиста?

Для меня однозначно — да! Смертельно опасна она в наши дни, особенно для журналистов "Народной воли".

И я уверен, что никто не платит им бешеных денег и никто из них не выйдет на пенсию в 45 лет.

Насчет кадровых военных. Нам нужны военные профессионалы, а не просто армия. И за численностью не нужно гнаться. Есть же страны, которые вообще не имеют армий. А посмотрите, какие ограниченные контингенты у некоторых наших прибалтийских соседей!

Поверьте, я не против того, чтобы бывшие участники боевых действий, офицеры, положившие здоровье при службе на точках, получали хорошие пенсии. Но вспомните: сколько майоров и подполковников дали армейские спортсмены — хоккеисты, футболисты, баскетболисты, биатлонисты, участники ансамблей песни и пляски, военпреды, военкоматчики, политуправленцы и т.д. и т.п. Которые никогда в жизни пороха не нюхали, которые всю жизнь катались как сыр в масле (дирижер оркестра — генерал-майор, начальник отдела кадров МО — генерал-полковник. Абсурд!).

И согласитесь: пенсионный комфорт армии отставников бывшего МО СССР за счет бюджета нищего государства, когда его коренных пенсионеров и близко не подпускают к этому бюджету, — это аморально!

Насчет Вашего общего трудового стажа, уважаемый П.Новиков. У меня он побольше, где-то около 47 лет.

О Ваших зенитно-ракетных войсках (ПВО). Знакомы ли Вы с комплексами "Тор" и "Тунгуска", фронтового прикрытия? В свое время я присутствовал там, где они создавались. Имею моральное право подойти к любому из них, положить руку на некоторые конструкции и сказать: "Это мое".

Сейчас Россия успешно торгует ими на арабском Востоке.

Всем понятна позиция тех людей, которым безразлично, из каких бюджетов им платят. Главное — чтоб платили. А за счет кого им платят, это их не интересует. Браво!

А насчет подсказки, где искать заработанные нами пенсии, мы как-то и сами сообразим. Тем более что Ваш "Совет Ветеранов" и "Союз белорусских офицеров" — эти основные опоры нынешнего режима с его "совхозными" законами — нам уже точно не помогут.

Вот что я хотел бы сказать товарищу Новикову.

**М.ГАРЕЛИК.**

*Минск.*

SOS!

# Получается, что право собственности у нас не гарантировано

Уважаемая редакция!

Хотелось бы и мне обратиться через газету к теме о так называемом расселении жильцов из ряда домов по улице К.Маркса, что в центре Минска. Стихийные обсуждения и дискуссии на интернет-форумах показывают, что, оказывается, подобные процессы, правда, в меньших масштабах, происходят по всему городу. По сути, складывается практика принудительного изымания жилья местной администрацией при полном игнорировании интересов людей и буквы закона. Получается, что право собственности в нашей стране вовсе не гарантировано, несмотря на то, что его призваны защищать соответствующие нормы Конституции и Гражданского кодекса. Отдают ли чиновники себе отчет в том, что своими действиями они подрывают авторитет не только государственной власти, но и гаранта Конституции? По всему видно, что это их не очень беспокоит, если они в открытую идут фактически на грабеж населения. Ведь для большинства людей квартира является единственным ценным имуществом, добытым усилиями многих лет и даже десятилетий жизни, не говоря уже о чисто эмоциональных факторах, связанных с рождением, длительным проживанием или наследством. Какой же смысл стремиться улучшать свои жилищные условия, если в одночасье кто-то совершенно произвольно и даже вопреки законам может все это отобрать?

Практически нарушено все что можно. Например, ст.44 Конституции, говорящая о неприкосновенности собственности и праве ее наследования; Гражданский кодекс, в частности, норма о праве собственности и главный принцип гражданского права — принцип справедливости. Наконец, статья 105 Жилищного кодекса, которая предусматривает выселение, но лишь в случаях, когда *"дом подлежит сносу в связи с изъятием земельного участка для государственных нужд"*. Что же, улицу Карла Маркса собираются сносить? И разве строительство казино и дешевой гостиницы входит в понятие *"государственных нужд"*? В статье 101 этого же Кодекса говорится, что *"принудительное отчуждение жилых помещений допускается только по мотивам общественной необходимости"*. Выходит, что для местных властей строительство увеселительных заведений как раз и составляет ту самую общественную необходимость, как они ее, вероятно, понимают. На этом фоне наскоро придуманная легенда о некоем белье на балконах, которое будет портить вид пешеходной улицы, выглядит жалко. Наверное, наши архитекторы и чиновники *"нового призыва"* экстраполируют свои привычки на коренных горожан.

И все это вершат не какие-то *"черные риэлтеры"*, а официальные лица, действующие от лица государства, которое, кстати, провозглашено у нас социально ориентированным. Печально, что, живя на своей родине, не нарушая законов и будучи во всех отношениях лояльными, граждане оказались не защищенными в своих элементарных человеческих правах. Сегодня они заложники решений, принимаемых без их ведома, участия и даже втайне от них.

**Александр КОНСТАНТИНОВ.**
**Фото photo.bymedia.net**

*Минск.*

ДАРЭЧЫ

**Жыхары дамоў са сталічнай вуліцы Карла Маркса выказалі намер перадаць уласныя подпісы ў Адміністрацыю Аляксандра Лукашэнкі. Такім чынам людзі пратэстуюць супраць намера гарадскіх улад выселіць жыхароў некалькіх дамоў дзеля ператварэння вуліцы Карла Маркса ў пешаходную зону.**

*Яўген ГУЧОК*

# Пра ногі і беларускую мову

*Перабілі ногі чалавеку*
*І на цэлы*
*белы свет*
*крычаць,*
*Што ніхто*
*ні сёння,*
*ні спрадвеку*
*Не забараняў яму*
*ні таньчыць,*
*ні скакаць.*
*Прыкладна*
*вось так*
*і з беларускай мовай*
*Абышліся Захад*
*і Усход,*
*А цяпер махляр*
*нам*
*цвердзіць-падсумоўвае:*
*"Сам ад роднай мовы*
*адмаўляецца народ".*
.....
*Адыдзіце --*
*не смярдзіце!*
*Дайце --*
*не перашкаджайце!*
*Ногі перабітыя*
*няхай сабе зрастаюцца,*
*Мова беларуская*
*да беларусаў*
*хай вяртаецца!*

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

## *Ірына Абельская па-ранейшаму працуе ў Мінскім дыягнастычным цэнтры*

**У мінулым годзе Аляксандр Лукашэнка зняў з пасады галоўнага ўрача Рэспубліканскай бальніцы Кіраўніцтва справамі прэзідэнта, свайго былога лечачага доктара Ірыну Абельскую. Пісалі, што яна пайшла працаваць звычайным доктарам. Цікава, як складаецца яе кар'ера зараз?**

**М.Курчанка,**
**Гомельская вобласць.**

Сапраўды, 10 красавіка мінулага года Аляксандр Лукашэнка нечакана для ўсіх вызваліў з пасады галоўнага ўрача Рэспубліканскай бальніцы Кіравання справамі прэзідэнта Ірыну Абельскую. Раней яна была вядома як лечачы ўрач Лукашэнкі. Абельскую называлі адной з самых уплывовых жанчын беларускай палітыкі.

Адстаўку Абельскай доўга абмяркоўвала не толькі медыцынская грамадскасць. Версіі будаваліся самыя неверагодныя. Хтосьці бачыў у гэтай адстаўцы хітры тактычны ход, а людская пагалоска прыпісвала Абельскай у будучым пасаду міністра аховы здароўя. Аднак праз пэўны час стала вядома, што кар'ерны ўзлёт доктара Абельскай скончыўся гэтаксама імгненна, як калісьці пачаўся. Пасля звальнення кандыдат медыцынскіх навук Ірына Абельская вярнулася на былое месца працы, у Мінскі дыягнастычны цэнтр.

Абельская і сёння працуе ў гэтай медыцынскай установе, у аддзяленні ультрагукавой дыягностыкі. У Ірыны Сцяпанаўны ёсць свой кабінет, а трапіць да яе на прыём можа кожны, хто мае адпаведнае накіраванне ад урача гэтага ж цэнтра.

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**

МНЕНИЕ

# Без парламентской формы правления государством мы никогда не будем счастливой нацией

Я не однажды обращался с этим письмом в редакции государственных газет, но, к моему глубокому сожалению, оно напечатано не было. Последний ответ меня вообще изумил: *"Ваше мнение о переходе на парламентскую форму правления страной не представляется нам содержательным, так как с 1991-го по 1994 год Республика Беларусь испытала на себе все "прелести" этой модели"*.

Вот так! Оказывается, у нас уже была парламентская Республика. А я-то и не знал. Как, думаю, и миллионы других белорусов. Впрочем, в 1991—1994 годах, а точнее, с 1990-го по 1995 год, действовал Верховный Совет 12-го созыва, но нельзя говорить, что в то время политическое устройство государства имело парламентскую основу. Да и тогдашний Верховный Совет избирался еще в бытность Советского Союза, когда по Конституции руководящей и направляющей была Коммунистическая партия.

Полагаю, мои рецензенты все это знают, но, являясь платными апологетами нынешней системы власти, беззастенчиво переворачивают все с ног на голову. И с этим я никогда не соглашусь. А потому и обратился в "Народную волю", чтобы донести до широкой общественности свой взгляд на проблему.

Почему я считаю, что Беларусь должна быть парламентской республикой, а не президентской? Во-первых, для такого утверждения достаточно исторических фактов. С давних времен нашему народу были ближе коллективные формы правления. Царизм к нам пришел после третьего раздела Речи Посполитой, то есть тогда, когда мы попали в тиски Российской империи.

Для нас, белорусов, последние два с лишним века — это сплошная тьма тирании. Не могли мы мечтать о свободе и при советской власти, когда на троне восседали генсеки-большевики. И когда развалился Советский Союз, не так просто оказалось вернуться к проверенному веками государственному устройству. У Верховного Совета 12-го созыва не было тех полномочий, которыми наделяется депутатский корпус в тех странах, где действует парламентское управление.

За полученную наконец свободу мы, белорусы, должны быть благодарны судьбе. Но, к несчастью, этому великому событию — рождению Республики Беларусь — не было дано объективной исторической оценки. Главная же ошибка в том, что, не проанализировав глубоко прошлое, мы в спешке проголосовали за создание не соответствующей ни традициям, ни своему менталитету такой формы правления, как президентская. По сути — это та же царская форма командования. В результате замученный, зацикленный на идеологии коммунизма белорусский народ реально вновь не стал свободным хозяином своей родной страны. Нас везут, мы едем, смотрим в окошко, но сами определенно не знаем — куда. Мы по-прежнему боимся быть свободными людьми; в этом все наши проблемы, а их надо решать. Самое страшное зло то, что прикидывается благом.

Только применение лучшего мирового опыта и творческой свободы народа, людей — есть единственный путь к лучшей жизни.

На мой взгляд, в нашей стране построен некий странный гибрид коммунизма и капитализма. Вместо свободы творчества живем в страхе, общество раскололось на "хороших" и "плохих", уже даже в семье невозможно свободно говорить о проблемах нашей жизни. А этого не должно быть; простите меня за откровенность, но стойловое состояние людей должно исчезнуть. Это надо срочно остановить, но КАК?

Да, я согласен с тем, что нам не нужны "розовые", "оранжевые" революции, да и вообще нам не нужны никакие политические революции, ибо они ничего доброго, разумного, путного не приносили и не принесут. А что же тогда? Нам необходимо спокойное, всенародное, взвешенное решение, и белорусский народ сегодня на это способен...

Оппозиция годы и годы толчет воду в ступе, то объединяясь, то разъединяясь. Но народу от этого не легче, хотя немало патриотически настроенных людей. И сколько еще будем стоять по стойке "смирно" и униженно просить диалога с властью? Просить ответов на наболевшие вопросы. Все это пустое и бесполезное дело, никто с нами разговаривать не будет. Потому что власть находится в руках одного человека.

Что же нам делать? Считаю, есть единственный законный, нравственный, объективный, разумный выход, не нарушающий ничьих прав: основательно, сообща подготовить и провести свободный всенародный референдум о введении НАВЕЧНО парламентской народной формы правления, где все будет подотчетно народу (его талаке). Только в таком случае у нас будут истинно народные депутаты, будет истинно народное правительство во главе с премьер-министром — лучшим представителем нации. Утверждаться и освобождаться члены правительства будут народным парламентом по результатам улучшения или ухудшения народной жизни. Все будут ответственны перед народом.

Я лично убежден, что парламентская форма правления — это лучшая историческая форма мудрости и добра. Только это может спасти нас от тупика, в который мы движемся, только это решит в перспективе наши большие и малые проблемы. Другого не дано, народ сам решит все!

С уважением —

**Евгений Иванович ШИДЛОВСКИЙ,**
**ветеран труда, пенсионер.**

*Минск.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2008 г.

# События в мире: европейский взгляд

## 61-й кризис

*В Италии пройдут досрочные парламентские выборы. Они состоятся 13 и 14 апреля.*

Предвыборная кампания началась после того, как президент Джорджо Наполитано объявил о решении распустить обе палаты парламента, чтобы разрешить правительственный кризис, начавшийся 24 января, когда правительство Романо Проди было

вынуждено подать в отставку, не получив вотум доверия в сенате.

Парламент в его нынешнем составе проработал менее двух лет. В стране в десятый раз за послевоенный период пройдут досрочные парламентские выборы. За это время сменилось уже 61 правительство.

По словам президента, досрочные выборы негативно отразятся на управлении страной. Но иного пути нет.

Все началось с отставки министра юстиции Клементе Мастеллы. Он обосновал свой уход недовольством системой судебных органов страны и заявил, что уходит в отставку "ради своего достоинства и чести". Достоинство и честь министра были задеты помещением его супруги под домашний арест. Сандру Мастелла обвиняли в вымогательстве взятки у главы больницы города Казерта.

После отставки министра юстиции левоцентристская коалиция Романо Проди потеряла большинство в итальянском Сенате, поскольку члены партии Мастеллы "Союз демократов за Европу" (СДЕ) отвернулись от премьер-министра. И премьер-министр подал прошение об отставке.

Коррупционный скандал стал лишь одним из поводов для выхода СДЕ из правительственной коалиции. Кабинет министров, возглавляемый Проди, планировал реформу избирательной системы Италии. Действующая система позволяла даже набравшим чуть более одного процента голосов избирателей партиям получить места в обеих палатах парламента. Эксперты называют нынешнюю систему власти в Италии "диктатом малых партий".

Ясно, что назрела необходимость выработки нового законодательства о выборах. Этим и руководствовался президент, поручая

спикеру верхней палаты парламента Франко Марини сформировать переходное правительство и разработать новый избирательный закон и уже по нему проводить выборы. Но он не смог привести политические силы страны к единой позиции для реформирования избирательной системы, передает агентство France Presse.

Усилия президента Наполитано назначить переходное правительство потерпели неудачу из-за противодействия Берлускони. 71-летний политик рассчитывает на победу на предстоящих выборах. Его правоцентристский альянс, согласно последним опросам, опережает по популярности блок левых партий на 16 процентов. Поэтому он настаивал на немедленных выборах.

До выборов Романо Проди продолжит руководить правительством, но затем уйдет из политики. "Что касается моего решения не выставлять свою кандидатуру на предстоящих выборах, о котором я объявил раньше, то я хочу подтвердить сказанное", -- заявил Проди.

Предполагается, что за голоса избирателей будут бороться глава правоцентристской оппозиции Сильвио Берлускони и мэр Рима Вальтер Вельтрони, глава вновь созданной леволиберальной Демократической партии.

**Сергей ИВАНОВ.**

**16 февраля Литва отмечает свой национальный праздник. Что важного и интересного произошло в стране за последнее время?**

## Венский бал в Вильнюсе

В Вильнюсской ратуше собрались нарядно одетые люди; джентльмены сопровождали дам, одетых в роскошные платья. Ровно в назначенное время раздались звуки вальса, и публика закружилась на ставшем уже традиционным Венском балу, уже седьмом по счету.

Во время праздника министру обороны Литвы Юозасу Олякасу было присвоено звание посла Венского бала за то, что он оказывает постоянную поддержку мероприятию и вместе со своей супругой Аурелией активно демонстрирует способности танцора.

Седьмой Венский бал в Вильнюсе стал благотворительным — входной билет для пары стоил 400 литов (1 евро/2383 лита), для студентов — 100 литов. Кроме того, участники бала участвовали в благотворительной лотерее, купив билет за 20 литов. Таких билетов было продано на сумму более 8 тыс. литов. Главный приз лотереи — оригинальное кольцо с алмазами.

Собранные во время Венского бала средства переданы Вильнюсской детской клинической больнице, передает "Интерфакс".

## Рекордный бюджет

Представлен бюджет столичной мэрии на 2008 год. Он стал рекордным — на 12% превышает бюджет 2007 года. Большие средства получены из Фонда приватизации, фондов ЕС. Большая часть бюджета будет израсходована на просвещение — на 75 млн литов больше, чем в прошлом году.

С учетом потребностей горожан и приоритетов развития города другая крупнейшая часть расходов будет выделена на развитие инфраструктуры. Это завершение прокладки южной объездной дороги, начало прокладки западной объездной дороги, строительство 8 эстакад.

Приоритетная область бюджета города — модернизация жилья. На эти цели выделено на 12% больше средств, чем в прошлом году. В 2008 году планируется обновить около 70 многоквартирных домов, заасфальтировать 200 дворов. На нужды культуры намечено выделить 50 млн литов. Эти деньги будут использованы для обновления 15 культурных объектов, на представление программы "Вильнюс — столица европейской культуры".

Старые дома будут модернизировать из фонда Игналинской атомной

Министерство охраны окружающей среды Литвы предлагает выделить 25 млн евро из фонда Игналинской атомной электростанции для модернизации многоквартирных домов.

Осуществление программы по модернизации многоквартирных домов начато в конце 2005 года. На сегодня из 590 инвестиционных проектов 238 уже осуществлены. В 2007 году было осуществлено 145 подобных проектов, сообщается на сайте Runet.

## «Литовское вторжение» в Москву

Литовец Римас Туминас, главный режиссер московского Государственного академического театра имени Вахтангова, собирается устроить "небольшое литовское вторжение" в русский театр. Он решил приглашать литовских режиссеров и внедрять в Москве принципы литовского театра.

"Я думаю, что можно хотя бы в области культуры отчасти продвинуть отношения между двумя странами, попытаться через культуру снизить цены на газ. Так мы сможем добиться того, чтобы нас услышали, показать, что мы гуманны, интересны, готовы работать, стирать понемногу границы русофобии", — сказал режиссер журналистам.

По словам Туминаса, сейчас как в России, так и за ее пределами трудно найти творцов, которые работали бы с серьезной драматургией. В театрах преобладает легкий развлекательный жанр. Поэтому приходится привлекать литовские ресурсы.

**Андрей КРАВЧУК.**

## ФОТОВЗГЛЯД

**В Кила-Райпуре в Индии проходят состязания, известные как "Олимпиада индийских крестьян".**

**Президент Франции Николя Саркози посетил Гвиану и поговорил с местными жителями.**

**Пакистан накануне выборов. Улицы Пешавара увешаны агитационными плакатами.**

# Большая восьмерка без России?

*Популярная немецкая газета "Suddeutsche Zeitung" публикует программу потенциального кандидата в президенты США от Республиканской партии Джона Маккейна. Ее суть: Большая восьмерка без России и поддержка демократии в странах, испытывающих ее недостаток.*

"Если я стану президентом США, одним из главнейших приоритетов для меня станет оживление трансатлантического партнерства и духовной солидарности, — *говорит Маккейн и продолжает:* — Наше будущее зависит от того, как мы справимся с вызовами, которые бросает XXI век. Это борьба с терроризмом и преодоление других опасностей, единая энергетическая политика, единый трансатлантический рынок и институциализация нашего сотрудничества в таких областях, как климатическая защита, помощь иностранным государствам и содействие распространению идей демократии.

Американцы поддерживают укрепление позиций ЕС — без этого будет невозможно адекватно ответить на вызовы нового времени. Кроме того, мы выступаем за дееспособное НАТО. Мы сможем укрепить альянс, если пригласим присоединиться к НАТО Хорватию, Албанию и Македонию. Одна из основных целей альянса - гарантировать безопасность в Европе и открыть дверь для таких демократических государств, как Украина и Грузия.

Запад должен выработать единую линию поведения в отношении России, руководство которой, по всей видимости, предпочитает взять старый курс на конфронтацию, чем примкнуть к демократическому курсу на мир, который избрал для себя Запад. Мы должны позаботиться о том, чтобы Большая восьмерка снова стала клубом ведущих демократических держав с рыночной экономикой: нужно принять в G8 Индию и Бразилию и исключить оттуда Россию.

Европа и США должны увеличить значимость и скоординированность наших программ для того, чтобы поддержать демократию и главенство закона в странах, испытывающих их недостаток. Такие программы важны в России, а также в Беларуси, где диктатура продолжает практиковать всеобщее подавление.

Чтобы справиться с вызовами XXI века, я поддерживаю идею создания "Лиги демократий". Ее целью будет не заменить ООН или другие международные организации, а дополнить их.

Она может вмешаться там, где действия ООН окажутся провальными — например, чтобы справиться с такими катастрофами, как дарфурская.

Если я стану президентом, я организую встречу представителей демократических стран для того, чтобы обсудить необходимые шаги по воплощению в жизнь этого видения реальности — по тому же принципу, как 60 лет назад Америка взяла на себя создание НАТО".

Надо заметить, что взгляды других кандидатов мало чем отличаются. Так считает Томас Манн — старший научный сотрудник Института Брукингса, член Совета по международным отношениям. Он говорит, что приоритетом восточноевропейской политики 44-го президента США — независимо от его или ее партийной принадлежности — будет Россия.

*"Ни один из кандидатов не сможет улучшить отношения с Россией. Самые жесткие высказывания о ней звучали из уст сенатора Маккейна. В меньшей степени — в выступлениях Хиллари Клинтон. Обаме в принципе свойственно стремление к диалогу. Так что он, вероятнее всего, будет вести переговоры. Но если ему не ответят взаимностью, то он, вероятно, займет такую же позицию, как и другие кандидаты в президенты",* — сказал он в интервью радио "Голос Америки".

## Ремни безопасности

**Исполнилось 25 лет британскому закону, согласно которому водители и пассажиры на переднем сиденье автомобиля должны пристегиваться ремнями безопасности.**

Как говорят британские чиновники, отвечающие за безопасность дорожного движения, принятие этого закона помогло спасти около 60 тыс. жизней и избежать 670 тыс. увечий.

Тем не менее отношение к ремням безопасности вряд ли можно назвать ответственным. Хотя 75% людей, вылетевших из автомобиля при аварии, погибают, при этом у тех, кто не пристегнут, шансы не удержаться в машине в 30 раз выше.

## Сколько калорий

**Еврокомиссия обнародовала предложения по гармонизации в странах ЕС правил маркировки пищевых продуктов.**

На упаковке должна содержаться информация о содержании калорий и питетельной ценности продукта. Причем информация должна быть четкой, ясной и легко читаемой.

Еврокомиссия считает, что правильная маркировка продуктов питания поможет европейцам сделать в продуктовом магазине осознанный выбор и будет способствовать снижению риска заболеть диабетом и другими заболеваниями, связанными с ожирением, приведет к уменьшению числа людей, страдающих от избытка веса.

## Новое о птичьем гриппе

**Новые экспериментальные результаты американских вирусологов позволили лучше понять, каким образом вирус птичьего гриппа обретает способность заражать человека.**

Этот микроб делается опасным для человека лишь после того, как в результате генетической мутации приобретает способность связываться с рецепторами вида 2—6. До сих пор считалось, что никаких других условий мутантные вирусы выполнять не должны.

Открытие поможет бороться с угрозой гриппозных эпидемий. Оно дает возможность точнее оценивать степень риска, которую представляют мутантные штаммы вируса гриппа. Можно также надеяться, что оно облегчит создание новых противогриппозных вакцин.

## КАЛЕЙДОСКОП

### Лучше, чем курица

**Владельцы закусочных в Таиланде с удовольствием отмечают бум продаж крысятины, вкус которой полюбился потребителям. В бедных районах на севере страны крысятина уже давно входит в рацион.**

Теперь же все больше придорожных торговых точек предлагают мясо крысы покупателям, готовым выложить 150 батов (4,82 доллара) за килограмм.

Крыс умерщвляют утоплением, снимают шкурку и продают как сырыми, так и вареными, жареными, запеченными или приготовленными на гриле. "Это лучше, чем курица", -- сказал один из покупателей агентству Ассошиэйтед Пресс.

### Энергия при ходьбе

**Американские и канадские ученые разработали аппарат, который способен преобразовывать механические движения человеческого тела при ходьбе в электроэнергию, сообщило агентство Рейтер.**

Ученые заверяют, что энергии, которую вырабатывает крепящийся к коленному суставу аппарат, будет хватать на зарядку десяти батарей от мобильных телефонов одновременно.

### Робот, который доит коров на пастбище

**Ученые нидерландского Сельскохозяйственного университета в городе Вахенинген создали робота, который доит коров на пастбище, сообщила газета "Телехрааф".**

Робот передвигается на гусеницах и отправляется вместе с коровами в поле. Коровы для доения стоят в очереди к роботу. За это каждая после доения получает дополнительный корм. Проведенные испытания оказались успешными -- только одна из них отказалась иметь дело с механической "дояркой".

### Опыты на козлах

**Военно-морские силы Великобритании в течение шести лет проводили эксперименты над козлами для изучения воздействия на них кессонной болезни, пишет Guardian со ссылкой на заявление заместителя министра обороны Великобритании Дерека Твигга.**

В 2000 году ученые Королевского флота решили использовать сходства строения черепа козла и черепа человека для изучения воздействия различных степеней декомпрессии. С помощью таких экспериментов ученые пытались определить, насколько опасно подводникам самостоятельно покидать на глубине подводные лодки.

Опыты проводились на военно-морской базе в Госпорте (графство Гемпшир) близ Портсмута и были прекращены в 2006 году. За время экспериментов погибли шесть козлов и более 400 животных, получивших повреждения мозга и подвергнувшихся другим "неприятным эффектам", были гуманно убиты, пишет Guardian.

## Тюремный срок за рукопожатие?

**Американскому адвокату предъявили обвинения в противоправном применении силы за то, что она, как утверждается, сильно трясла руку федерального обвинителя во время рукопожатия, сообщает телерадиокорпорация Би-Би-Си.**

Авдокат Кети Брюэр Рентас, которой 49 лет, защищала в суде штата Флорида своего супруга, которого в итоге приговорили к 90-дневному домашнему аресту за наркотики и нарушение условия досрочного освобождения. После приговора суда адвокат подошла для рукопожатия к обвинителю Дженнифер Кин и, по словам очевидца, стала трясти руку Кин с такой силой, что чуть не вырвала ее. "Во время рукопожатия Брюэр делала быстрые движения рукой вверх и вниз и направляла Кин ближе к земле, так что последняя почти упала", -- сказал офицер безопасности суда.

После задержания и разбирательства Брюэр Рентас была отпущена из заключения под залог в 100 тысяч долларов. По ее словам, она не хотела причинить Кин вреда.

Вместе с тем пресс-секретарь из органов юстиции сообщил, что нападение на федеральное должностное лицо является серьезным деянием, и если Брюэр Рентас признают виновной по предъявленным обвинениям, то ей будет грозить до года тюрьмы.

## Новое в диагностике рака простаты

Рак предстательной железы — одна из самых распространенных болезней в развитых странах. Среднестатистическая смертность от нее составляет более 20%.

Самым прогрессивным методом на сегодняшний день является определение в крови ПСА — простатического специфического антигена, количество которого в крови резко возрастает при возникновении раакового образования в простате. Как правило, это происходит у мужчин пожилого возраста. Но болезненный анализ — биопсия — не всегда достоверен.

Новый тест определяет наличие в крови вещества, выделяемого непосредственно раковыми клетками. По словам профессора Гетценберга, возглавлявшего исследовательскую группу, подобный анализ точен на 94%. Планируется, что новый метод будет внедрен в практику через полтора года, когда закончатся длительные клинические испытания.

Анализ также покажет, поражена ли раком только простата, или болезнь уже распространилась на другие органы.

## Супербактерия

Аргентинские ученые обнаружили в водах Антарктики неизвестную ранее бактерию. Она способна выжить в экстремальных условиях — в соленой и щелочной среде, а также при очень больших перепадах температуры. С ее помощью специалисты рассчитывают вывести новые сорта злаков, устойчивые к переменам погоды, передает НТВ. Исследователи даже представили свой проект президенту Кристине Киршнер. Она пообещала его поддержать, если эксперименты окажутся удачными.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2008 г.

ВПЕЧАТЛЕНИЯ

# Как Владимир Петров делает женщин счастливыми

**Больше всего на свете я люблю классическую музыку. Но где ее сейчас услышишь? Разве что в воскресенье вечером передачу по Белорусскому радио, которую ведет Татьяна Песнякевич, да по каналу "ТВ-центр" каждый понедельник поздно вечером. "ЛАД" совсем, мне кажется, перестал рассказывать о знаменитых оперных певцах и певицах. Спорт, сериалы и всякие клубы...**



Когда мне подарили пригласительный билет во Дворец профсоюзов на концерт Владимира Петрова, я обрадовалась. Вышла из метро, а около Театра имени Янки Купалы толпится народ. "Вот она, культурная жизнь", — подумала я и пошла дальше. Около Дворца Республики тоже было очень много народа. Но Дворец Республики мне недоступен, билеты там очень дорогие, а во Дворец профсоюзов можно сходить. Народу тут тоже было предостаточно, некоторые — с цветами, с коробками конфет. Очень много интеллигентных женщин зрелого возраста — казалось, что партер заполонили одни женщины! Вручили бесплатную программку. "Кто такая Татьяна Третьяк?" — спрашиваю у старушек, сидящих рядом.

"Да это же ведущая артистка Оперного театра. Как она в "Травиате" поет! Люди плачут..."

"А Петров?" — продолжаю интересоваться я.

"Ну, он же на-род-ный артист Республики Беларусь!" — медленно и с гордостью отвечают соседки.

Мне было стыдно за свое невежество. Хотя раньше я очень часто посещала Филармонию и знаменитостей не пропускала, но в последние годы приобращаться к искусству становилось все более проблематично.

И вот гаснет свет, на сцену выходит очень стройная, с дивной осанкой, красивая, похожая на зарубежную киноактрису 60-х годов певица. Романсы известные, кажется, ничего новенького, но когда я услышала песню "Я ли в поле да не травушка была", в конце у меня невольно вырвалось "Браво!". Столько чувства, столько страдания вложено в исполнение — это просто высший класс! Очень красивый сильный голос, и владеет им Татьяна Третьяк прекрасно. Надо будет обязательно сходить на "Травиату" в Дом офицеров, билеты, говорят, совсем не дорогие — до 15 тысяч рублей.

А у Владимира Петрова какой мощный голосище!

Быстро, очень быстро пролетело первое отделение. Самое роскошное пение — это исполнение дуэтом известнейшего романса Булахова "Не пробуждай воспоминаний". Это было волшебно! Не хуже, чем в свое время пели дуэтом Галина Вишневская и Иван Козловский.

А во втором отделении певцы немного отошли от программы и исполнили всеми любимые романсы на музыку Чайковского, Рахманинова и других знаменитых авторов. А как вдохновенно аккомпанировал на стареньком рояле Estonia Георгий Карант! И сын Владимира Петрова Илья Петров. Совсем молоденький, похожий на студента консерватории. Да так оно, видимо, и есть на самом деле. Династия музыкантов получается.

Концерт удался на славу. Владимиру Петрову подарили даже картину. Было много цветов, оваций и криков "Браво!".

И у меня был счастливый день, и показался он мне огромным, как в детстве...

**Анна ВАСИЛЬЕВА.**

СЛЫШАЛИ?

## *«Свободный театр» отправился на гастроли в Англию*

**Белорусский "Свободный театр" отправился на гастроли в Великобританию. Планируется, что в течение ближайшего месяца коллектив выступит в Лондоне и Лидсе.**

Как сообщил БелаПАН художественный руководитель "Свободного театра" Николай Халезин, английской публике будут представлены постановки "Быть Гарольдом Пинтером" и "Поколение Jeans". Также в ходе гастролей планируется реализовать педагогический проект с Британской школой сценической речи и драматургии: белорусскому коллективу предложили провести недельный курс со студентами.

Накануне отъезда труппы в Минске состоялась премьера спектакля "Грум" по произведению современного драматурга Деа Лоэр, поставленного "Свободным театром" совместно с немецким режиссером Каем Охремом.

*"Этим спектаклем мы продолжили наш опыт работы с европейскими режиссерами — ранее у нас ставил Кристиан Бенедетти"*, — заметил Н.Халезин. Напомним, во время премьерного показа спектакля французского режиссера Кристиана Бенедетти по пьесе Эдварда Бонда "Одиннадцать рубах" в августе 2007 года сотрудниками правоохранительных органов были задержаны все зрители и актеры "Свободного театра".

"Свободный театр" — независимый театральный коллектив, который входит в Европейскую театральную конвенцию. Он также является лауреатом премии Французской Республики в области защиты прав человека и в то же время не имеет в Беларуси собственной сцены и финансирования.

З НАВАСЕЛЛЕМ!

*Аляксандр ГРЫГАРАЎ:*

# «Кватэры прадастаўляюцца толькі лепшым спартсменам»

**На пачатку месяца прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі падпісаў пастанову, згодна з якой прызёрцы чэмпіянатаў свету і Еўропы біятланістцы Кацярыне Івановай і гандбольнаму трэнеру Леаніду Бразінскаму ў карыстанне прадастаўлены службовыя кватэры.**

Аб паляпшэнні жыллёвых умоў спартсменаў перад Саветам міністраў хадайнічала Міністэрства спорту.

Саўмін вырашыў прадаставіць жыллё на ўмовах дагавора найму службовага жыллёвага фонду дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Так, **Кацярына Іванова** атрымала кватэру ў Мінску па вуліцы Сонечнай агульнай плошчай 53,28 квадратнага метра. У гэтым памяшканні разам са спартсменкай будзе жыць яе муж **Сяргей Вінаградаў** і маленькі сын Іван, якому зараз толькі паўгода.

Дарэчы, у Федэрацыі біятлону кажуць, што зараз Кацярына Іванова разам з мужам знаходзіцца ў Амерыцы.

Заслужанаму трэнеру СССР **Леаніду Бразінскаму** прадастаўлена кватэра ў Магілёве агульнай плошчай 79,1 квадратнага метра.

"Народная воля" звязалася з міністрам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь **Аляксандрам Грыгаравым**, каб падрабязней даведацца аб тым, каму і на якой падставе выдзяляецца жыллё.

*"Гэта звыклая практыка,* — гаворыць Аляксандр Уладзіміравіч. — *Такім чынам заахвочваюцца перспектыўныя спартсмены, якія паказваюць годныя вынікі. Вы ведаеце, што жыллём забяспечваюцца атлеты, якія сталі прызёрамі Алімпійскіх гульняў. Што тычыцца Івановай і Бразінскага, то тут гэтае жыллё выдзялялася па іншай схеме. Перад Міністэрствам спорту і турызму за згаданых спартсменаў хадайнічалі федэрацыі біятлону і гандболу. Мы ў сваю чаргу хадайнічалі перад Саветам міністраў, і ўжо там вырашылі пытанне аб прадастаўленні жылля. Прычым гэтыя кватэры прадастаўлены спартсменам на перыяд дзеяння працоўных адносін паміж імі і Міністэрствам спорту".*

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

СВЕТСКАЯ ХРОНИКА

*Виталий АРТИСТ:*

# «Признавайте новые имена!»

**На днях в Минске прошла третья церемония вручения музыкальных наград "Мистерия Звука", на которой были названы самые продаваемые белорусские исполнители.**

Продюсер премии Адам Старпович уверен, что его награды отражают четкую картину музыкальных предпочтений.

*"Мы составляем список из 10 главных бестселлеров года,* — говорит Старпович. — *Данная премия — своеобразная форма благодарности тем людям, которые записывают и выпускают качественный продукт. Они пропагандируют белорусскую музыку и стимулируют ее развитие на всех уровнях: от звукозаписи до дистрибьюции. Страна должна знать своих героев — это и есть главная цель наград. Например, в этом году в десятке лишь два поп-исполнителя. Все остальное — рок-музыка разных видов.*

*Насколько результаты "Мистерии" справедливы для всего рынка? Естественно, я не могу дать 100-процентную гарантию, поскольку точных данных продаж по всей стране просто не существует. Мы пришли к выводу, что с вероятностью 80—90 процентов эти итоги верны. Единственный серьезный случай несовпадения данных "Мистерии" с иными сведениями был связан с Виктором Калиной в 2005 году. Дело в том, что в отличие от других артистов его основные продажи были не в Минске, где находится большинство магазинов "Мистерии звука"), а в регионах. Но сейчас подобных ему в плане аудитории артистов просто нет. А значит, и вероятность расхождений значительно ниже".*

Церемония вручения проходила в одном из минских кафе. Перед торжественным вручением дипломов Адам придумывал визитки-поздравления. Одной из таких визиток Старпович чуть не обидел победителя Топ-10 группу J:морс. Старпович признался, что не хотел награждать этот белорусский коллектив из-за каких-то своих субъективных соображений. В ответ на это, получая награду, солист J:морс Владимир Пугач, судя по всему, не захотел пожать ему руку. Но все же пожал.

Артисты были немногословны. Отличился только солист beZ bileta Виталий Артист. В своей речи он просил "старых" белорусских звезд уступить место "молодым" и не узурпировать и так малое количество радиоволн.

*"Хочу сказать тем, кто уже давно в шоу-бизнесе, что пришло время признать молодых,* — сказал он. — *Признавайте новые имена! Молодым хочу пожелать, чтобы не звездили и были конкурентоспособными".*

После "раздачи слонов" все отправились на фуршет.

**Лилия ВОЛКОНСКАЯ.**

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

## *Владимир ПУГАЧ, солист J:морс:*

— Когда записали пластинку "Босиком по мостовой", очень надеялись, что хотя бы песню "Не умирай" возьмут на радио. Для себя мы решили, что это не радийный альбом, но в итоге в ротацию попали порядка 5 песен. С тех пор я собственным прогнозам вообще не верю. Когда заканчиваешь работу над пластинкой, объективно не можешь оценить, что ты сделал...

## *Леонид ШИРИН, автор музыки проекта «Da Vinci»:*

— Очень приятно получать награды и понимать, что группа пользуется популярностью. Честно говоря, начинали мы это делать просто в свое удовольствие, без расчета на успех. Нам удалось, видимо, поймать волну ностальгии и куража. Музыкальная ситуация в стране оживает, и это радует. Чем больше хороших проектов, тем больше людей, с которыми можно общаться и соревноваться.

## *Кто в лидерах?*

**J:морс** "Босиком по мостовой"
**Тяни-Толкай** "Как же долго я тебя искал"
**N.R.M.** "06"
**Ляпис Трубецкой** "Капитал"
**J:морс** "Адлегласць"
**beZ bileta** "Кино"
**J:морс** "Ледоколы Live" (без учета DVD)
**Крамбамбуля** "Святочная"
**Da Vinci** "Bum-bum"
**Крама** "Усё жыццё — дзіўны сон"

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

## *Памяці Курта Кабэйна прысвячаецца...*

**22 лютага ў клубе "Рэактар" святкуюць дзень нараджэння культавага лідэра гурта Nirvana Курта Кабэйна.**

У мерапрыемстве возьмуць удзел каманды розных музычных накірункаў: Partyzone, "Ліцвінтроль", "Мутнае вока", Unia, Zaniapad. Гурты сыграюць некалькі песень Nirvana і асабістую праграму.

*"Курт Кабэйн — сапраўды адыёзная асоба,* — гаворыць лідэр гурта Partyzone Яўген. — *Гурт Nirvana паказаў свету даволі цікавыя рэчы, да гэтай пары запатрабаваныя людзьмі. На канцэрце, акрамя перапеваў песень Nirvana, мы збіраемся прэзентаваць свой новы альбом "Падаць і ўзлятаць". Гэта будуць прыгожыя, не цяжкія песні".*

## *Блюз ад Віктара Шалкевіча*

**23 лютага ў малой зале канцэртнай залы "Мінск" — сольны канцэрт вядомага гродзенскага барда і акцёра Віктара Шалкевіча.**

Падчас канцэрта адбудзецца прэзентацыя дыскаў "Смутны беларускі блюз" і "Балады і рамансы".

Кошт квіткоў — ад 12 000 да 20 000 тысяч беларускіх рублёў.

## *«Самае дарагое» ад Людмілы Чурсіной, Нэлі Уваравай і Георгія Тараторкіна*

**Тэатральны праект "Віртуозы сцэны" 7 сакавіка запрашае ў канцэртную залу "Мінск" на трагікамедыю па п'есе японскага драматурга Юкіо Месіма "Самае дарагое — бясплатна".**

У спектаклі занятыя такія знакамітыя артысты, як **Георгій Тараторкін, Людміла Чурсіна, Вольга Кабо, Нэлі Пшонная, Нэлі Уварава** і іншыя. Дзеянне адбываецца ў Токіо. Спадар Таракіці прыводзіць у дом у якасці прыслугі жанчыну, якая дваццаць гадоў таму была яго палюбоўніцай, але зараз ёй няма чаго есці...

Кошт білетаў — ад 25 да 90 тысяч.

## *Станіслаў Садальскі, Жанна Эпле і Руслана Пісанка разыходзяцца па-маскоўску*

**22 сакавіка ў Цэнтральным доме афіцэраў — камедыя "Развод па-маскоўску". У галоўных ролях — Станіслаў Садальскі, Ала Даўлатава, Руслана Пісанка, Жак Даніэль, Жанна Эпле, Амаду Мамадаков і іншыя.**

Таленавіты дантыст, эфектны халасты мужчына Іпаліт задаволены сваім жыццём. Ён — кумір жанчын. Аднак для таго, каб ажаніцца, яму прыйшлося не толькі разбурыць міф аб сваёй жанатасці, але і знайсці першую жонку...

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## *За мяжой Забораў нарасхват, а ў Беларусі...*

**Сусветнавядомая мастацкая галерэя Уфіцы ў Фларэнцыі набыла карціну мастака беларускага паходжання Барыса Заборава "Аўтапартрэт з мадэллю".**



Як паведамляе Радыё Свабода, Барыс Забораў стаў другім пасля Марка Шагала мастаком з колішняга СССР, чыя творчасць прадстаўлена ў гэтай мастацкай скарбонцы Фларэнцыі.

"Аўтапартрэт з мадэллю", які цяпер выстаўлены ў прэстыжным калідоры Вазары галерэі Уфіцы, уяўляе сабой вялікае палатно прыкладна 2 метры шырынёй і 1 метр вышынёй. Злева намалявана фігура мастака, адбітая ў люстэрку, а справа — фігура дзяўчыны, створаная ў манеры фотанегатыву. Крытыкі называюць карціну варыяцыяй на тэму "мастак і яго муза".

Акрамя галерэі Уфіцы, мастацкія творы Заборава захоўваюцца ў аўстрыйскай галерэі Альберціна, фундацыі сучаснага мастацтва Ніжняй Нарманды, гарадскім музеі нямецкага Дармштату, Траццякоўскай галерэі і музеі Пушкіна ў Маскве, Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску.

Барыс Забораў нарадзіўся ў 1935 годзе ў Мінску ў сям'і мастака віцебскай школы Абрама Заборава. Займаўся кніжнай графікай, тэатральнымі дэкарацыямі. У 1981 годзе эміграваў у Парыж.

Творы Барыса Заборава часта выстаўляюцца на міжнародных аўкцыёнах. Паводле меркаванняў экспертаў, іхны кошт складае ў сярэднім некалькі дзесяткаў тысяч еўра. Што да Беларусі, то ўсяго тры гады таму ніхто не захацеў набываць ягоны малюнак нават за 900 долараў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 ЛЮТАГА 2008 г.

Сяргей ДУБАВЕЦ

# Востраў Ікарыя

## Эсэ пра Ігара Германчука

*...Захоплены палётам Ікар занадта наблізіўся да сонца. Воск, што змацоўваў ягоныя крылы, расплавіўся ў гарачых промнях. Ікар упаў у мора і загінуў. Тое мора назвалі Ікарыйскім, а той востраў, дзе пахавалі Ікара, — Ікарыя.*

**Міф пра Дзядала і Ікара**

Ніколі не думаў, што буду пісаць успаміны, тым больш пра Ігара Германчука. Зрэшты, і цяпер, спрабуючы расказаць пра нашы з ім супольныя справы, я таксама не "пішу ўспаміны". І зусім не таму, што няма чаго прыгадаць. Якраз наадварот. Гэта ўсё адно, што апісваць мацярык ці, прынамсі, востраў. Дзесяткі і сотні эпізодаў, вартых таго, каб іх распавесці, усплываюць у памяці. На кнігу хопіць, і не на адну. Але... Сам працэс апісання былога супярэчыць майму трываламу перакананню, што жыццё заўсёды — наперадзе. Тое, што ззаду, зараз жа пагружаецца ў змрок, нібы ў пакоі, з якога сышлі і выключылі святло. Толькі тое, што наперадзе, вартае нашага клопату, затрачанага часу, высілкаў. Тое, што ззаду, мусіць афармляцца ў вобразы, сюжэты і міфы, зноў жа для таго, каб спатрэбіцца нам заўтра ў якасці прыкладаў найбольш светлых і выніковых учынкаў і найбольш характэрных памылак, якія не варта паўтараць зноў. Няма ніякага сэнсу ў служэнні мінулым дням. Сэнс толькі ў тым, што наперадзе. Ігар Гермянчук цалкам падзяляў такое светаадчуванне.

Магчыма, у іншым часе, у іншым пераламленні святла і напішуцца мемуары, але не ў нас і не цяпер. Бо тое, пра што былі нашы мроі і дзеля чаго былі нашы высілкі, засталося недаробленым, незавершаным, незакрытым як тэма. Гэта яшчэ не тая кніга, якую можна было б паставіць на паліцу. Таму сёння я паспрабую не столькі ўспамінаць, колькі акрэсліць, кім стаў і кім застаецца Ігар Гермянчук для мяне і для сваёй краіны, якой ён служыў беззапаветна і безаглядна.

### Праобраз героя

Паводле сваёй прыроды Ігар ніколі не быў сузіральнікам або статыстам, персанажам масоўкі, пятым ці нават другім у нейкай справе, а толькі першым ува ўсім, за што браўся. Калі б нам спатрэбіўся герой нашага часу, ягонае імя і тут прыгадалася б першым.

Герой — асоба настолькі ж рэдкая, наколькі знаёмая і пазнавальная. Нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо ўсе героі, якіх ведала чалавецтва, маюць свой "модуль" і апісаныя яшчэ ў антычнасці. Таму, вызначыўшы Ігара як героя, мне заставалася толькі знайсці ягоны праобраз. Гэта Ікар. Такі самы безаглядны і аддады свайму палёту, як безаглядны і адданы сваёй справе быў Ігар Гермянчук. І скончыліся абедзве гісторыі аднолькава. Але пра гэта пазней.

Мы і не заўважаем, як часта паўтараюцца ў нашым жыцці антычныя лёсы. Тут няма перабольшання. Бо што ў антычнасці, што цяпер чалавек мае адно жыццё і адну смерць, ён зведвае любоў і роспач — у іх абсалютных велічынях. Толькі не задумваецца пра гэта, каб не спалохаць гэтымі велічынямі сябе самога і сваіх блізкіх. Але сутнасць ад гэтага не змяняецца.

Чалавек, які распавёў нам гісторыю Ікара, — рымскі паэт Авідзій — яшчэ адзін персанаж, без якога не абыдзецца маё апавяданне пра Ігара Герменчука. У Авідзія мы прачыталі, што бацька Ікара Дзядал быў геніяльным скульптарам ды вынаходнікам. Каб вырвацца з нявολі на востраве Крыт, ён зрабіў сабе і сыну крылы. Ён зляпіў іх з пер'я і воску. "Ляці не занадта нізка, каб пер'е не набрыняла вадою, — настаўляў ён Ікара, — і не занадта высока, каб сонца не растапіла воск".

Яны падняліся ў неба. Людзі, што бачылі іх з зямлі, прымалі іх за багоў, бо толькі багі ўмеюць лятаць. Гэта быў цудоўны палёт. Мала таго, што ён вёў іх да вызвалення, дык сам працэс быў настолькі фантастычным, а Ікар настолькі захапіўся ім, што ўрэшце забыўся на бацькава папярэджанне — не набліжацца да сонца. Калі ты захоплены сваёй справай напоўніцу, цябе заўсёды вабяць новыя вышыні. Так тое і адбылося. Ікар стаў ахвярай свайго захаплення. Ён падняўся занадта высока, сонца растапіла воск, і юнак упаў у мора.

Разважаючы пра Ігара Герменчука, я ўвесь час сутыкаюся з гульнёй гукаў, з алітэрацыямі і супадзеннямі, якія то падказваюць мне накірунак думкі, то замінаюць выкладаць думку стройным празаічным тэкстам. І я разумею, што сёння найлепей было б ягоны лёс апісаць вершам.

Ролю Дзядала ў Ігаравай версіі міфа адыграў ягоны родны дзед, або дзядуля, які быў для Ігара самым вялікім аўтарытэтам у сям'і — тым першачалавекам, на ўзор якога Ігар арыентаваўся заўсёды і ва ўсім. Ён наогул быў гадаванцам не асяроддзя, а гэтага самага свайго канкрэтнага дзеда, пра якога ўвесь час згадваў як пра апошнюю інстанцыю, маральны аўтарытэт і ўзор паводзінаў.

Між іншым, гэтаксама, як ён багаміў свайго вясковага дзеда, я багаміў сваю вясковую бабулю. І гэта таксама лучыла нас, быццам пэўнае адзінства базавых звестак і пачуццяў. Але і пра гэта я скажу пазней.

Чамусьці ў гісторыі Ікара нас зусім не бянтэжыць тое, што з павелічэннем вышыні палёту тэмпература паветра насамрэч робіцца не вышэйшай, а ніжэйшай. Нас гэта не бянтэжыць, нібы гэта ўсяго толькі прыклад аксюмарана, такіх мы штодня студэнтамі шмат чулі на занятках, і яны для нас станавіліся ледзьве не галоўнымі прыкметамі журналістыкі: гарачы снег, звонкая цішыня, жывы труп...

Праўда, я ўсё ж зраблю закладку на гэтым эпізодзе. І каб лішні раз разбурыць статычную скамянеласць, у якой звычайна малююцца нам персанажы антычнага свету. І каб даць большую прастору гэтаму параўнанню Ігара з Ікарам.

Немагчыма паверыць, што насельнікі гор, вынаходнікі такарных станкоў, прагматычныя бегуны-атлеты і будаўнікі Парфенона не ведалі мяжы чалавечых сіл і элементарных законаў фізікі ды наіўна верылі, што варта табе ўзляцець на сотню-другую метраў, як ты наблізішся да спякотнага дыска сонца. А нават калі яны так думалі, дык мы ж разумеем, што сам факт гібелі легендарнага Ікара ніяк не мог быць абумоўлены сонечнай спякотай. Версіі пераахаладжэння, браку паветра, страты сіл або нечага староннягa ўмяшання ў палёт гучаць больш праўдападобна, хоць і не так паэтычна.

Кажу гэта для таго, каб сцвердзіць, што і ў жыцці Ігара Герменчука засталося шмат загадак, да якіх мы яшчэ будзем вяртацца не аднойчы менавіта таму, што маем справу не з простым персанажам ці фігурантам, а з героем нашага часу.

### Нараджэнне творцы

З Ігарам мяне звёў лёс. Так бывае. Два нібыта зусім розныя чалавекі з розных асяроддзяў, якіх, апроч узросту, нічога не аб'ядноўвае, пачынаюць адчуваць адзінства і інтуітыўна прыцягваюцца між сабой. Што цікава аднаму, робіцца цікава другому. Скажам, я спяваў, і Ігар з усіх сіл імкнуўся спяваць, я цікавіўся польскай мовай, і Ігар браўся за пальшчызну. Я слухаў "Deep Purple", і ён настройваў свае "рэцэптары" на ўспрыманне такой музыкі. Недзе ў падсвядомасці я часам адчуваў, наколькі ўсё гэта "не туды" для майго светлагорскага прыяцеля, асабліва калі бачыць яго ў рамках пэўнага сацыяльнага і культурнага стэрэатыпу. Але Ігар ніколі і не спрабаваў адпавядаць гэтаму "свайму" стэрэатыпу, з міжвольнымі адзнакамі якога ён прыехаў у сталіцу. Ён літаральна рабіў сам сябе з чыстага ліста. І ў якасці напарніка яму падвярнуўся я.

Стварэнне самога сябе не выяўлялася ў перайманьніцтве. Было інакш. Дай мне гэта, скажы, чаму гэта так, а не інакш, чаму табе гэта падабаецца. Ён не мог дазволіць сабе быць хоць на паўпрыступкі ніжэй. Ягоны ўнутраны зарад — я магу ўсё! А хто можа ўсё? Усё можа герой.

Магу ўсё — гэта не абавязкова ведаю і ўмею, але — гатовы. Да прыкладу, я не магу сцвярджаць, што Ігар умеў рабіць норы для сну ў стагах, распальваць агонь пад зліваю ў лесе альбо, скажам, даіць карову. Але ўсяму гэтаму я навучыўся ад яго. Гэта была прыродная воля да выжывання ў любых умовах.

Мы пазнаёміліся на ўступных іспытах на факультэт журналістыкі. Выйшла так, што нам абодвум не хапіла балаў, каб патрапіць на дзённае навучанне, але хапіла на тое, каб залічыцца на вечаровае. Мне пра гэта абвясцілі, я выйшаў з кабінета, а ён у калідоры складаў свой дыпламат і сказаў, што яму вынеслі той самы вердыкт. Так вось нас адно з адным жыццё і звяло. З гэтага ўсё і пачалося.

У нас з ім не было таго, што называецца "шмат агульнага". Хутчэй, наадварот. Але нейкая невядомая сіла быццам выцягвала з нас нешта агульнае і, на першы погляд, нязначнае, каб ператварыць гэта нешта ў галоўнае. Так мы абодва загаварылі па-беларуску ў гэтым чужым для беларушчыны свеце. Але мова — толькі адзін прыклад. Пасля будзе яшчэ мноства знакаў лёсу, якому было заўгодна звесці нас разам. І гэта тычылася не толькі нас саміх, але і нашых блізкіх або знаёмых. Калі на пачатку 1980-х майму бацьку рабілі серыю складаных аперацый, аказалася, што доктарка, якая апякуецца бацькам, — родная сястра Ігара.

Яшчэ адзін прыклад — з часоў Ігаравай службы ў войску ў Архангельску. Варта было мне даслаць яму выразаны з "ЛіМа" артыкул Пятра Садоўскага пра культуру мовы, як неўзабаве я атрымаў ад Ігара адказ. У нейкай архангельскай сталоўцы ён апынуўся ў адной чарзе з гэтым самым Садоўскім, якога вылучыў з групы турыстаў па яго беларускай мове. І хто тады мог падумаць, што гэтыя два занесеныя на край свету салдацік і турыст стануць калісьці дэпутатамі Вярхоўнага Савета і ініцыятарамі незалежнасці сваёй краіны...

А тады, паступіўшы на вечаровы журфак... Удзень мы працавалі, а вечарамі на занятках далучаліся да сваёй групы, дзе каго толькі не было з сённяшніх зорак ды майстроў, прызнаных у сваёй прафесіі. У той час — ад восені 1977 года — з нас літаральна фантанавалі ўсялякія ідэі і прага пазнання ды творчасці. Проста на лекцыях мы пісалі "парадковыя" апавяданні, аповесці і нават раманы. Радок Ігар, радок я, радок Ігар, радок я... Выходзіла і смешна, і рызыкоўна, і заўсёды нечакана. Сёння мяне шчыра ўражваюць аб'ёмы напісанага разам за які-небудзь год-паўтара. Быццам мы кудысьці спяшаліся, быццам інтуітыўна імкнуліся акрэсліць сваю жыццёвую прастору, сваю тэрыторыю. Цяпер, з вышыні часу, я, здаецца, разумею, у чым тут справа.

Толькі дапаўшы да беларушчыны, мы імкнуліся збудаваць свой форт, свой замак, заняць свой востраў, дзе ў моры навакольнае варожасці і абыякавасці наша захапленне магло б выжыць і развівацца. Але беларушчына заўжды была такім вострававам у моры ўсеагульнай ніякавасці, як вольная краіна і вольная нацыя пасярод нічым не абазначанага насельніцтва.

Малалікасць нацыі адносна насельніцтва перадвызначыла для Беларусі гэты сіндром "астраўной дзяржавы". Усе, хто тут гаворыць па-беларуску, думае і жыве па-беларуску і пачуваецца адзіным арганізмам — гэта ўсяго толькі група сярод асноўнай масы. Гэта іх ідэал — незалежная Беларусь, гэта ім яна патрэбная ўсвядомлена і безумоўна. Гэта іх мільён галасаваў супраць білінгвізму і замены дзяржаўнай сімволікі на рэферэндуме 1995 года. Але іх меншасць. І сёння яны — пакуль толькі востраў пасярод афіцыйна абвешчанай незалежнай дзяржавы. Тыя лідэры насельніцтва, што прыўласцілі іх ідэал, не маглі разам з ім не прыўласціць і гэты сіндром астраўной дзяржавы, што ў перакасабочаным выглядзе праявіўся ў сённяшніх арыентацыях Беларусі на дзяржавы-ізгоі і ў адчуванні сябе вострававам у варожым моры паміж Захадам і Усходам, Поўначчу і Поўднем. Але трыццаць гадоў таму ў нас было толькі ўласнае адчуванне сябе першаадкрывальнікамі гэтага ці то няжылага ці то пакінутага вострава, што распраўляла нам крылы.

Але супольнае пісанне мусіла ў нешта трансфармавацца. І тады прыйшло захапленне радыёп'есамі. Мы інсцэніравалі свае раманы ў гукавым фармаце — з рознымі галасамі, музыкай і спецэфектамі. Вядома, што там асаблівага можна было запісаць у мяне дома на бабінавы магнітафон. Але трэба было бачыць, колькі з нас прамянілася жывога жадання! Думаю, што якраз тады ў маім светлавалосым прыяцелю пасяліўся дух творчасці, які пасля ніколі не дасць Ігару ператварыцца ў кандовага савецкага журналюгу, што правільнымі штампамі піша правільныя перадавіцы. Словам, тады і пачаўся ягоны фантастычны палёт, які ўжо не адпусціць Ікара да самае смерці.

Нашы апавяданні і радыёп'есы былі поўным хуліганствам, але толькі на першы погляд. Па сутнасці гэта было выпрабаванне межаў этычнага і эстэтычнага, таго, што ты сам можаш сабе дазволіць і лічыш вартасным, і таго, што не. Гэта і была "пастаноўка голасу", якую ў найбольшай меры давала нам такая вось "адвязаная" творчасць — без цэнзуры, без рэдактуры, без досведу. Гэта і быў пачатак нашага досведу.

Некалі адзін оперны спявак распавядаў, што юнаком для таго, каб паставіць сабе голас, ён ішоў у горы і там крычаў, пішчаў, рохкаў — выдаваў з сябе ўсе магчымыя гукі, у выніку чаго пазнаў сам сябе — свае магчымасці, свае моцныя і свае слабыя бакі. Нешта падобнае адбывалася з намі, калі мы чыталі на мікрафон уласныя "парадковыя" радыёп'есы — такія сабе школярскія трылеры — з пагонямі, крыкамі, забойствамі ды безліччу ўсяго падобнага.

Але аднаго самапазнання было мала. Хацелася новых ведаў і адчуванняў. Многія нашы калегі часта кажуць замест "я скончыў БДУ" — "я скончыў нацыянальную бібліятэку" ("ленінку" — як яе тады называлі). Тое самае маглі б сказаць і мы з Ігарам. Але тут патрэбнае ўдакладненне. Захапленне кнігамі чакала нас у канцы доўгага падарожжа.

### Выпрабаванне крылаў

Мы падарожнічалі бясконца. Адразу нават без усялякай мэты. Бо таго, што мы бачылі ў вандроўках, было так шмат, і мэтаю станавілася сама Беларусь. Вось мы аўтастопам выпраўляемся ў Браслаў. А вось вырашаем проста па дыяганалі прайсці Шаркоўшчынскі раён. Бальшыню пешага шляху займае непралазная пушча, і нам насустрач выбягае цэлы вывадак малых янотаў... І, натуральна, паўсюль людзі — сапраўдныя вясковыя людзі, да якіх так цягнуцца нашы душы і праз якіх мы ў поўнай меры і пазнаем сваю Беларусь.

Вёска прываблівала сваёй завершанай карцінай чалавечага свету. Скажаш "дзядзька" або "цётка" — і адразу перад вачыма вобраз чалавека. У горадзе такога не было. За гарадскімі зваротками "молодой человек" ці "женщина" ніхто канкрэтна не прамалёўваўся. Вось чаму нас прыцягвала і захапляла вёска. І, натуральна, прырода. І, зразумела, старая архітэктура. Ды, зрэшты, усё, што трапляла ў поле зроку, было цікавае.

Вось пасля "бульбы" з-пад Клімавічаў мы выпраўляемся ў сталіцу без капейкі грошай і не магістральнымі, а ўсялякімі бакавымі дарогамі, дзе пад'язджаем, дзе проста ідзем, начуем у сціртах, харчуемся папрашайніцтвам. І ні ў чым не маем адмовы. І ні ў чым няма недахопу.

З часам вандроўкі становяцца мэтавымі і асэнсаванымі. Вось мы цэлую ноч сядзім у гасцях у Лявона Луцкевіча ў Вільні, разглядаючы старыя фотаздымкі і канспектуючы расповед гаспадара — факты абсалютна новай для нас беларускай гісторыі XX ст. А вось мы малюем у сіні колер ліштвы на хаце Ларысы Геніюш у Зэльве. Вакол — сад і мора кветак. Пасля гаспадыня частуе нас яешняй, доўга чытае свае вершы і дорыць кніжкі са сваёй бібліятэкі... А вось у майстэрні Кастуся Харашэвіча ў Маладзечне мы разглядаем на карцінах ветракі. Вятрак — незвычайны сімвал...

А паваротным уражаннем у вандроўках стаў Мір. Руіна замка і само мястэчка ўразілі настолькі, што мы кінуліся да кніг. Тады і пачалася "ленінка". Бо нічога асаблівага ў даведніках, што пад рукой, мы не знайшлі. І нават падалося нам, што пра гэткае дзіва людзі проста нічога не ведаюць (а так яно і было), і наша чытацкая цікавасць ператварылася ў даследніцкую. У "ленінцы" былі перагорнутыя сотні тамоў. Мы шукалі і выпісвалі са старых беларускіх, польскіх, расійскіх кніг звесткі пра Мір, але можаце сабе ўявіць, колькі ўсяго мы прачытвалі і выпісвалі адначасова. Гэтак паралельна вывучалася гісторыя Уніі, мы зразумелі, якое месца ў беларускай культуры займае Вільня, складалі радаводы князёў — сярэднявечных кіраўнікоў Беларусі, даведаліся пра беларусізацыю 1920-х гадоў, якую ў трыццатыя спынілі сталінскія рэпрэсіі...

А колькі "паралельна" было выпісана ў нататнікі вершаў, цытат, фактаў!.. Аднак цэнтральнай тэмай заставаўся Мір. Ужо не проста гісторыя, а мноства пытанняў, адказу на якія няма і дагэтуль. Асабліва нас, дваццацігадовых, уразіў факт змены ўладальніка Міра, калі гаспадар замка, наш раўналетак, але ўжо дасведчаны ваяр і дужы чалавек князь Юры Ілліініч піша запавет, якім пасля сваёй смерці перадае Мір сябру дзяцінства і таксама дваццацігадоваму, але хвораму і слабому Радзівілу Сіротку. Чаму? — не можам зразумець мы, — чаму Ілліініч у свае дваццаць гадоў думае пра смерць? Мы быццам гатовыя рынуцца ў тую эпоху, каб папярэдзіць нейкую няясную пагрозу і бяду. Але не паспяваем. І праз год наш Ілліініч раптоўна памірае...

Пагрузіўшыся ў тыя колішнія часы, я зноў думаю пра эфемернасць успамінаў. Проста нерэальна, каб за нейкі адзін толькі год было зроблена і пераэжыта столькі ўсягоўсякага. Згадваю свой тагачасны "графік" і дзіўлюся яго перапоўненасці. Раніцою праца слесарам на заводзе "Гарызонт", потым заняткі на саксафоне ў заводскім клубе, потым лекцыі на журфаку, потым вечарынка нашай групы на прыватнай кватэры. Гадзіне а чацвёртай вяртаюся дахаты, а сёмай маці будзіць на завод. Так кожны дзень. І пры гэтым я, бадай, ніколі не чытаў і не адкрываў для сябе ў літаратуры столькі новага, колькі ў той год. Сітуацыя Ігара была яшчэ больш насычанай, бо ён мусіў сам дбаць пра свой мінскі быт.

А яшчэ... Ігар працаваў тады на паліграфкамбінаце — развозіў электракарам тыражы і пільна сачыў за ўсім, што выходзіла новага, а мы атрымлівалі ўсе цікавыя нам кнігі проста са станка. Але выносіў Ігар з камбіната не толькі кнігі. Тады, яшчэ да таго, як забяруць у войска мяне, а пасля і яго, мы пачалі камплектаваць сваю ўласную падпольную друкарню. Праўда, гэта асобная вялікая тэма.

### Супраціўленне паветра

Па шчырасці, не магу адназначна сказаць, што я ставіўся да Ігара як да сябра. Але ў тым, што ён ставіўся да мяне так, сумневаў у мяне ніколі не было і няма. Не адзін раз Ігар рэальна падтрымліваў і ратаваў мяне, затуляючы ад небяспек. Ён быццам апекаваўся мною.

Сяброўства — гэта ўвогуле феномен не таго, хто думае, што ён камусьці сябра, а — таго, другога, каму ён сапраўды сябра. Нездарма ж чалавек заўсёды задумваецца, калі яго просяць назваць сапраўдных сяброў.

Пра тое, хто нам сябры, ведаюць нашы сябры, мы пра гэта ведаць не можам.

Напэўна, я ставіўся да Ігара як да брата. Брат — гэта чалавек, такі самы, як я. І ў такой ступені, як да сябе, я магу быць не толькі ўважлівым і абярэжным, але і забыўлівым ці няпільным у дачыненні да свайго брата. Сяброўства — з'ява нашмат больш тонкая.

У дзяцінстве шмат сяброў. Кожнага, з кім гуляеш у пясочніцы, называеш сябрам. Праўда, мая бабуля маіх першых выпадковых дружбаноў, з якімі сыходзіўся на мазырскім рынку, пагрозліва называла "дружкамі". Так панятак "сябра" пачынаў дзяліцца і крышталізавацца.

У дарослацсі сяброў не бывае шмат. Прычым у гэты панятак не абавязкова ўваходзяць міндальныя дачыненні альбо тая кніжная "ўзаемавыручка". З гадамі ў мяне склаўся свой вобраз сябра. Сябра — той, хто табе ніколі не адкажа адмовай. Вось і ўсё. Можна не выказваць адзін аднаму сімпатыяў, можна не бачыцца гадамі. Але калі з'явілася гэтая настроенасць на адну хвалю і пакуль яна не прападае, існуе сяброўства — самы цяжкі, дарэчы, тып дачыненняў, яго не падробіш.

Сябра — больш, чым знаёмы, больш, чым брат, і больш, чым ты сам. Мне даводзілася сустракаць думку, што найлепшае сяброўства — па перапісцы. Тады, маўляў, чыстая сувязь, якая існуе паміж людзьмі (нават знешне незнаёмымі), можа захоўваць тую формулу адносінаў. Я разумею, адкуль такая "стэрыльнасць". Калі людзі ўвесь час побач, дык увесь час узнікае спакуса выпрабаваць сяброўства — зрабі мне то, зрабі мне гэта. І такім чынам унутраная повязь загаворваецца, разыходзіцца на дробязі і ўрэшце прападае.

Нашы два гады войска — гэта і была перапіска. Прызнаюся, сёння на перачытванне Ігаравых лістоў мне давялося патраціць не дзень і нават не тыдзень. А колькі перасылалася бандэроляў з газетамі, часопісамі і кнігамі. А яшчэ — працяг нашых парадковых, дакладней, цяпер ужо пастаронкавых раманаў. Старонка туды, дзве назад, тры туды, чатыры назад... Лісты хутка ператвараюцца ў бандэролі, якія ўрэшце губляюцца недзе ў паштовай прорве ўсесаюзнага ведамства. Мы пачынаем спачатку...

Перапіска скончылася разам з арміяй. Але Ігар захаваў сваё стаўленне да мяне да канца жыцця.

Як толькі ў мінскім студэнцкім асяродку ўтварылася "Майстроўня", нашых таварышаў пачалі "цягаць" на "гутаркі" супрацоўнікі КДБ. Прапаноўвалі "супрацоўнічаць", абяцалі дапамагчы з вучобай, з працай, з жыллём, ці, наадварот, у выпадку адмовы — ускладніць сітуацыю з вучобай, працай, жыллём. Пасля такой сустрэчы Ігар адразу распавёў, што яго "цягалі" і прапаноўвалі, і пагражалі. Што рабіць? Займець свайго "казачка" ў органах для нас, нашчадкаў партызан-падпольшчыкаў, выглядала справай само сабой зразумелай. Якраз Ігар сумняваўся найболей. Але наша ўпартасць і бяскрайняя вера Ігара ва ўласныя сілы перамаглі.

Гутаркі-шпацыры з асабістам доўжыліся іншы раз аж чатыры гадзіны і страшэнна вымотвалі. Тым больш што ніякага асаблівага плёну для нас ад іх не было. Ігар казаў пра гэта кожны раз, калі вяртаўся з такой "прагулянкі". Пакуль урэшце сам не прыняў рашэнне спыніць гэтыя сустрэчы.

### Набліжэнне да сонца

Не раз мы з Ігарам абмяркоўвалі гэтую тэму яшчэ ў часы ягонага дэпутацтва. І абодва пагаджаліся, што найлепшай кандыдатуры наступнага прэзідэнта Беларусі не знайсці. І не толькі таму, што Гермянчук стаў прызнаным рэдактарам самай масавай недзяржаўнай газеты "Свабода", здолеў наладзіць газетнае прадпрыемства, быў абазнаны ва ўсіх сферах жыцця краіны і меў свой погляд на тое, куды трэба рухацца, як разбірацца з праблемамі. Ён добра ведаў і цяперашняга прэзідэнта і мог дастаткова аб'ектыўна параўноўваць ягоны досвед, стыль, ідэалогію са сваімі ўласнымі і бачыў поўную перавагу свайго яснага бачання шляху краіны над тым пакручастым і нікому не зразумелым намацваннем дарогі, якім мы ўсе займаемся гэтыя трынаццаць гадоў. Пры гэтым мы ніколі не ведаем, што з намі будзе праз год і ў які бок ужо заўтра павядзе нас усіх наш кіраўнік.

Мабыць у гэтым была галоўная перавага Ігара. Чалавек, які любіць і ведае сваю краіну і свой народ, які мае волю і зразумелае бачанне таго, што ў краіне павінна адбывацца, ніколі не стане цямніць і ашарашваць людзей сваімі рашэннямі. Навошта, калі ты ўпэўнены ў сабе і ведаеш, што трэба рабіць?

Ігар разумеў, што ён здолее перацягнуць сімпатыі народа на свой бок, прычым не злоўжываючы папулісцкай рыторыкай, не падманваючы людзей і не робячы з прэзідэнцтва фетышу асабістае ўлады. Такіх амбіцыяў у Герменчука не было.

З усіх чалавечых якасцяў у ім была толькі адна, якую часам называюць як адмоўную — гэта зацятасць у працы. Але без гэтага ці магчыма было б на пустым фактычна месцы ствараць нешта?

Ігар не быў зацятым у палітыцы — вось што галоўнае. Як творца, ён прагнуў гармоніі, а не парадку. Згарманізаваць інтарэсы розных грамадскіх сіл — нашмат больш складаная задача, чым усіх паставіць на лінейку гатоўнасці. Вось жа, Герменчук ведаў, што ягонаму патэнцыялу адпавядае больш складаная задача.

Пасля смерці Ігара Беларусь не стала бліжэй да ягонага ідэалу. Не стала яна і якойсьці іншай. Яна нібы застыла ў сваім шляху.

Востраў Ікарыя сёння — ціхі прытулак курортнікаў. Хоць і тут некалі кіпелі страсці. У 1912 годзе ікарыйцы абвясцілі незалежнасць ад Турцыі. Новую краіну так і назвалі — Ікарыя. Нават марку сваю выпусцілі (амаль як БНР). Але неўзабаве востраў занялі грэкі, і ўсё скончылася. Вось такая сумная гісторыя. Хоць да нашага міфічнага вострава яна мае такое ж дачыненне, як сучасныя грэкі да міфічнага Ікара. І як сучасная РБ да той, якая мроілася Ігару Герменчуку.

Існуе версія, паводле якой сам Авідзій, у якога мы і прачыталі пра Ікара, знайшоў свой уласны апошні прыстанак недзе на Палессі, там, адкуль родам Ігар. Згадваецца верш Уладзіслава Сыракомлі "Авідзій на Палессі". Кажуць, там дагэтуль ёсць узгоркі, якія людзі называюць гарамі Авідзія...

### Гібель Ікара

Мне, як рэдактару, хацелася рабіць нешта такое, што пераверне гэты свет і нарэшце зробіць беларусаў нацыяй, і ўсё зайграе, запяе і будзе шчасце. Рабіць без ніякіх бізнесаў, рэкламы ды іншых рацыянальных пралікаў. Але нармальныя газеты ў нармальным свеце так не робяцца. І гэта разумеў Ігар. Які проста стаяў на зямлі, як бы высока ні лятала ягоная душа.

Калі чалавек дасягнуў завершанае цэльнасці ў сваёй прафесіі і ў жыцці, пра яго ўжо не кажаш — цалкам выкладаўся ці там — працаголік. Можна выкладацца разбэрсана і нічога пры гэтым не дасягаць. Але калі ты прафесіянал і цэльная натура, дык само сабой зразумела, што ты — выкладзешся цалкам. Так было з Ігарам.

Створаную ў 1990 годзе газету "Свабода" я разглядаў як пляцоўку для адраджэння "Нашай Нівы" — беларускай газеты на ўсе часы, пра якую я марыў, але не пачуваўся гатовым адразу ўзяцца за такую адказную справу. Трэба было стварыць калектыў, паклікаць аўтараў, скласці канцэпцыю і ўвогуле адчуць гэта ўсё ў працы. На тое і прызначалася газета "Свабода". Праз год мне ўжо здавалася, што ўсё гатова для адраджэння "Нашай Нівы". Але і "Свабода" тым часам пачала афармляцца ў самастойнае выданне, хаваць якое не было ніякага сэнсу. Тады і прыйшла ў галаву думка перадаць гэты задзел іншаму рэдактару — Ігару Герменчуку, які тады быў дэпутатам Вярхоўнага Савета. Заўважу, што перадавалася не прадпрыемства і не ў поўнай меры газета, а толькі задзел, эскіз, брэнд, які ўжо меў сваіх чытачоў.

Ігар узяўся за справу, і нашы канцэптуальныя падыходы пайшлі паралельнымі шляхамі. "Наша Ніва" хілілася да высокае культуры, да інтэлектуальных тэкстаў, да спасціжэння беларускае сутнасці і пошуку новых паняткаў ды ідэй, да мадэрнізацыі беларушчыны і ўпісання яе ў кантэкст сусветнай культуры. "Свабода" ў руках Ігара імкліва ператваралася ў самую масавую апазіцыйную газету, якую чытала і ведала ўся краіна. Вось калі ягоны прафесіяналізм і загартоўваўся і рэалізаваўся адначасова. І гэта быў сапраўдны рэдактарскі палёт, а сам Ігар станавіўся ў вачах калег і публікі ідэальным рэдактарам на ўсе часы.

Уявім сабе гэты палёт Ікара. У ім зразумелая эйфарыя вольнае прасторы і захапленне вышынёй, і пераадоленне зямнога прыцягнення. Словам, дзіва што такое. Але вось што незразумела. Кожны, каму даводзілася скокаць з парашутам ці, скажам, з вышкі ў ваду ці хоць бы лятаць на самалёце, ніколі не страчваў думкі пра бяспеку — пра страхоўку, адпаведную глыбіню вады ці надзейнасць лятальнага апарата. Пры ўсёй эйфарыі гэтае ўсведамленне заўсёды прысутнічае, хоць бы на самым краі свядомасці. У выпадку з Ікарам уражвае тое, што ў яго такой думкі не было. Ён проста ляцеў, набіраючы вышыню і зусім не думаючы пра тое, што будзе далей. Чаму?

Верагодна, ён не бачыў нічога, ніякай іншай будучыні для сябе, апроч гэтага самага палёту. Альбо бачыў сонца як цалкам рэальную мэту. Гэта я не да таго, што ў Ікара цалкам адсутнічала пачуццё асцярогі, а да таго, што нашу звычайную асцярогу ў выпадку Ікара нешта мусіла замяніць. Інакш кажучы, ягоная безаглядднасць мусіла б нечым тлумачыцца. Але чым?..

І гэта зноў быў вельмі насычаны і плённы для нас з Ігарам час.

Мы шмат супрацоўнічалі, раіліся і спрачаліся. Найбольш спрачаліся з-за мовы.

Памятаю, аднойчы зайшоў у Ігараў кабінет, а там ужо быў нейкі наведвальнік. Рэвізор з амерыканскага фонду, падобны да вялікага зайца, пытаўся на ламанай расійскай мове: "Пакажыце, дзе ў вас у газеце рускі язык". Дзіўна мне стала — быццам самае галоўнае, што цікавіць амерыканца ў папулярнай дэмакратычнай газеце — гэта прысутнасць расійскай мовы.

Для мяне гэта дагэтуль вялікае пытанне. Пытанне да нашых — пра білінгвізм, і пытанне да іх — якія чамусьці так дбаюць пра тое, каб дэмакратыя ў Беларусі, крый божа, не развівалася ў сваім нацыянальным рэчышчы — як тое адбылося ва ўсіх нашых суседзяў. Што гэта і навошта? Для мяне неаспрэчным застаецца тое, што ніякае дэмакратыі ў неўсвядомленай Беларусі дасягнуць немагчыма. Перш чым захацець свабоды, ты павінен адказаць сабе на пытанне — а хто я такі? Нездарма ва ўсіх вядомых нам прыкладах, дзе адбылася дэмакратычная трансфармацыя, яна ішла побач з нацыянальным адраджэннем. А інакш што б нас аб'ядноўвала і падымала на перамены? Насельніцтва можа толькі бунтаваць, а на тое, каб змяніць сістэму, патрэбны народ. І менавіта родная мова ператварае людскі тлум у народ.

Ігар падзяляў такія думкі, але мусіў падпарадкоўвацца і таму асяроддзю, у якім працаваў, і заакіянскім спонсарам, якіх тое самае асяроддзе і настройвала адпаведным чынам. Аднойчы я прапанаваў Ігару: калі ўжо ўсё так безвыходна, давай тэксты па-руску ставіць асобнай старонкай. Назавем іх "рашн пэйдж", і пісаць гэтыя старонкі буду я. Нейкі час гэтая схема працавала і стала, па-мойму, цікавым прэцэдэнтам. Бо пасля меркавалася ўвесці "інгліш пэйдж" і яшчэ іншыя, але пасля нешта зламалася. Як кажуць у такіх выпадках, "сілы былі няроўныя" — маю на ўвазе націск нашых "чыстых дэмакратаў" і "чыстых бізнесоўцаў". Для мяне не было дзівам, што такі падыход прывядзе да заняпаду газеты. Бо "Свабода" ніколі не была і не магла ў тых умовах стаць бізнес-праектам. Яна была газетай-пасланнем. І пасланне яе ў тым і заключалася — ідзем да дэмакратыі праз усведамленне сябе народам. Білінгвізм ставіў на гэтым пасланні крыж. Бо яго сутнасць на старонках аднаго выдання — гэта раскол свядомасці на дзве часткі, тое, што ў псіхіятрыі называецца шызафрэніяй.

Ігар быў абсалютна апантаны ідэяй "залатой сярэдзіны", што, зрэшты, і выяўляе ў ім сапраўднага рэдактара-прафесіянала. Але, відаць, не ў нашым асяроддзі. Нават пасля, у часопісе "Кур'ер", ён строга пралічваў працэнт мовы, што дазволіць яму збіраць дастатковую рэкламу ўсялякіх модных гадзіннікаў. Як паказаў час, для такой дзейнасці патрэбная была іншая краіна, іншая Беларусь. У Ігаравым выпадку асяроддзе станавілася ўсё больш варожым, бізнес урэшце цалкам перастаў рэкламавацца нават у памяркоўнай прэсе.

У нас ніколі не было разыходжанняў што да роднае мовы ў прынцыпе. Але Ігар, як большы за мяне рэаліст і практык, свядома і балесна (я гэта бачыў) саступаў абставінам у спадзеве ўрэшце перайграць сітуацыю. На жаль, каб давесці гэтую гульню да перамогі, яму не хапіла жыцця.

У кожным сваім інтэрв'ю Ігар паўтараў: галоўнае — прафесіяналізм. А ўжо што такое журналісцкі прафесіяналізм, ён за гады сваёй працы і зразумеў, і акрэсліў для сябе дасканала.

Гэта быў якраз той выпадак, калі ўсе сілы былі кінутыя на адзін фронт, калі яйкі былі складзеныя ў адзін кошык, калі брамніка замянілі шостым палявым гульцом. Не столькі "поўная самааддача", але поўная канцэнтрацыя асобы на адным накірунку. Што ў такіх выпадках бывае — ведаюць усе. Пан або прапаў.

Ён так і жыў — максімальна сканцэнтраваны на мэце, заўсёды адкрыты наперад.

А завалілі яго ззаду. З крыл.

...Калі Ікар настолькі захапіўся палётам, што не зважаў ужо ані на вышыню, ані на вокрыкі свайго бацькі Дзядала, ані на тое, што крылы рассыпаюцца на ягоных руках, тады ён зразумеў раптам, што бяда будзе сувымерная шчасцю ягонага палёту. Бо ні пра якія падстрахоўкі ён папросту не думаў. Кажуць, рак паражае чалавека ў момант самага вялікага псіхалагічнага стрэсу. Кажуць, рак — гэта ўвогуле не хвароба. Гэта такое членістаногае, такі амшэлы вадзяны жук, які поўзае па марскім дне задам наперад і толькі чакае моманту, калі яму ў клюшні зваліцца з неба мёртвае цела Ікара. А які яшчэ мог быць найбольшы стрэс для Ігара, што абсалютызаваў свой журналісцкі палёт і беззапаветна верыў у сілу сваіх крылаў, як не "адстаўка з паста рэдактара за непрафесіяналізм"?

У герояў не бывае маленькіх пачуццяў. Таму адстаўка з прафесіі была ўспрынята як адстаўка з жыцця...

***

Упершыню фрагмент "Метамарфозаў" Авідзія, у якім распавядаецца гісторыя Ікара, на беларускую мову пераклаў Максім Багдановіч. Было гэта ў нашаніўскую пару, на пачатку XX стагоддзя. Загадка гэтага перакладу ў тым, што там няма гібелі Ікара. Дайшоўшы да таго месца, дзе Дзядал і Ікар падняліся ў паветра і кожны, хто бачыў іх з зямлі, прымаў за дзівосных багоў, паэт спыніў пераклад. І кожны, хто сёння чытае стары міф па-беларуску ў інтэрпрэтацыі Максіма Багдановіча, застаецца перакананы, што палёт Ікара працягваецца.

ВЕРСІЯ

# Нашы продкі заснавалі Рым?

**Палачане і крывічы з'яўляюцца продкамі этрускаў, якія заснавалі Рым у VIII стагоддзі да н.э., лічыць доктар філасофскіх навук Валерый Чудзінаў, акадэмік Расійскай акадэміі навук, старшыня камісіі РАН па культуры старажытнай і сярэднявечнай Русі. Пра гэта вучоны заявіў на сустрэчы з наведвальнікамі XV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу ў нацыянальным выставачным цэнтры "Белэкспа".**

Ён лічыць, што славянскія мовы з'яўляюцца дыялектамі адзінай рускай мовы, надпісы на якой сустракаюцца з часоў палеаліту. Разам з тым, паводле меркавання В.Чудзінава, у паўночным паўшар'і руская мова была адзінай да канца неаліту, калі са з'яўленнем жывёлагадоўлі і земляробства пачалося выдзяленне асобных этнасаў, якія гублялі сувязь з "вялікай радзімай" і ў якіх праз прыкладна 100 гадоў пачаліся змены ў мове. Апрача таго, як сцвярджае В.Чудзінаў, аналіз надпісаў на археалагічных знаходках сведчыць аб тым, што і Заходняя Еўропа была рускай да пачатку германскай каланізацыі ў канцы XI стагоддзя. Паводле яго слоў, у выніку фанетычнага развіцця ўзнікаюць словы нямецкай і англійскай моў. *"Так што Еўропа была пагружана ў старажытную рускую культуру, і мы абагацілі многія мовы, пасля чаго кожная з іх пайшла сваім шляхам"*, — зазначыў В.Чудзінаў.

Паводле яго слоў, у працэсе даследаванняў ён дэшыфраваў этрускую мову і паказаў яе блізкасць да беларускай. *"З тэрыторыі цяперашняй Беларусі палачане і крывічы па заходнім беразе Чорнага мора цераз цяперашнія Румынію і Балгарыю прыйшлі на паўвостраў Малая Азія, а затым морам прыплылі на астравы Крыт і Корсіка, з якой пачалі асвойваць Паўночную Італію"*, — сказаў вучоны. Паводле яго слоў, паўднёвая мяжа каланізацыі праходзіла непадалёк ад горада Чэрветэры, што азначае "Чырвоная Этрурыя".

*"Прачытаўшы надпісы пад малюнкамі са сцэнамі жыцця этрускаў, на іх адзенні я знайшоў рускамоўныя словы-дублёры, блізкія да беларускамоўных. Гэтыя словы былі зашыфраваныя ў пасмах валасоў, у барадзе, у складках адзення і шнуроўцы чаравікаў. Такім чынам, па этрускай мове можна вывучаць старажытную беларускую мову"*, — сказаў В.Чудзінаў. Паводле яго слоў, аналагічная сітуацыя з распаўсюджваннем рускай мовы прасочваецца ў многіх еўрапейскіх краінах ад палеаліту да сярэднявечча.

Беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук Сяргей Тарасаў лічыць гэтую версію не адпавядаючай ісціне. У інтэрв'ю БелаПАН ён зазначыў, што палачанаў з этрускамі раздзяляе не толькі прастора, але і час — прыкладна дзве тысячы гадоў. Падругое, паводле слоў гісторыка, пад палачанамі маюцца на ўвазе не столькі крывічы, якія жылі на цяперашняй тэрыторыі Беларусі, колькі людзі, якія заснавалі дзяржаву — Полацкае княства.

*"Вось чаму, мякка кажучы, не даводзіцца казаць, што нейкім чынам палачане і крывічы з'яўляюцца заснавальнікамі далёкай цывілізацыі этрускаў — папярэдніцы Старажытнага Рыма"*, — падкрэсліў вучоны. Разам з тым ён заявіў, што *"не супраць міфатворчасці, якая не мае ніякага дычынення да сапраўднай навукі, прысутнічае ў сучаснай гісторыі і крыху бударажыць розум непрафесіяналаў, якія любяць легенды пра Нэсі і зялёных чалавечкаў"*.

**Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.**

ТРУДОВЫЕ БУДНИ

# Как найти работу за границей?

*Тем, кто планирует летом отправиться на заработки за рубеж, уже сегодня нужно оформлять все документы. Репортер "Народной воли" узнал, как студенты могут выехать и трудоустроиться за пределами нашей страны.*

Существуют различные программы, по которым любой желающий студент дневной формы обучения может поехать работать за границу. Цена поездки зависит от многих факторов. Например, от страны, в которую решил ехать работать студент. Так, поездка в США по одной из самых популярных программ CCUSA (Camp Counselors USA) стоит около 800 долларов. Ко всему этому нужно добавить стоимость услуг консультанта, страховку на случай отказа в визе, билет (туда и обратно).

Студент, который желает поехать на заработки за границу, должен быть не старше 24 лет и учиться на очном отделении (правда, не на последнем курсе). Обязательно знание английского языка на разговорном уровне. "Если на вопрос: "How are you?" — вы отвечаете: "My name is Vasya", — то тогда вам пока не к нам", — так говорится на сайте одной из фирм, предлагающих подобные вояжи.

Трудоустройством студентов за границей на время каникул занимается и БРСМ. Прошлым летом, например, за пределами Беларуси трудились около тысячи человек. Правда, список стран невелик: Российская Федерация, Польша и Украина. Основные виды работ за рубежом — строительство дорог, сельскохозяйственные работы, сервисное обслуживание, педагогическая деятельность. Новым является договор на работу студенческих отрядов в Ямало-Ненецком автономном округе, куда изъявили желание съездить и поработать 74 человека.

## Звонок в турфирму

— Набор на студенческие программы продолжается до 15 марта 2008 года, — сказали мне в одной их столичных турфирм, которая рекламирует свои услуги. — Но чем быстрее вы это сделаете, тем раньше пойдете в посольство получать визу. Для участия в программе нужно предоставить справку из деканата о том, что вы являетесь студентом дневного отделения, ксерокопию паспорта и фотографию. В этом году стоимость программы будет составлять около 1800 долларов (авиабилеты входят в эту сумму). Если вы решили участвовать в программе, вам необходимо пройти небольшое устное собеседование на английском языке с одним из сотрудников нашего офиса. После успешного прохождения собеседования участник подписывает договор и оплачивает первый взнос, который составляет 300 долларов, заполняет анкеты по программе. Оставшаяся сумма оплачивается до конца февраля...

## Из жизни «бывалых»

Студент 3-го курса Белорусского государственного университета **Антон Трафимович** минувшим летом ездил в США в штат Мэйн по студенческой программе.

"Меня интересовала не столько работа, сколько американская культура, совершенствование разговорного английского языка, — говорит он. — Поехал наобум. Не знал, где буду жить, где работать... Первую ночь пришлось ночевать на улице. Очень сильно повезло, так как встретил русских эмигрантов, которые мне и помогли найти работу, квартиру. В месяц за жилье нужно было платить 1000 долларов. Правда, нас было четверо, так что еще терпимо. Первая моя работа — это ремонт дома, который принадлежал бывшей украинке. Я был подсобным рабочим: подносил нужные вещи, убирал мусор... За час мне платили 10 долларов. Это довольно много. Хотя были работы, где можно было заработать и больше, например, на стройке. Занимался покраской дома, тоже за 10 долларов в час. Работал по 8 часов в день. А по выходным мыл посуду в ресторане. Однажды уронил тарелку, которая разбилась. Первая моя мысль: "Сейчас на меня будут кричать..." Но, к моему удивлению, на меня не ругались, наоборот, спросили, не поранился ли я и все ли в порядке... Это так поразительно. Да и вообще, меня много что удивило в Америке. Там люди намного проще относятся к жизни. Это у наших людей постоянно депрессия, они ходят хмурыми... У нас в стране незнакомые люди не здороваются на улице друг с другом. А в Америке все наоборот. Там в порядке вещей, если прохожий поздоровается с тобой, поделится своим хорошим настроением... Взять те же магазины. Продавец здоровается с каждым покупателем, интересуется его делами, вежливо и культурно обслуживает, улыбается. А у нас как? Нередко можешь натолкнуться на продавца с недовольным выражением лица, который еще и нагрубит тебе. В Америке все делается для людей. Поражает отношение к человеку. Там есть все условия для жизни инвалидов. Нет такой проблемы, например, как подняться на верхние этажи жилого дома. Все предусмотрено. Правда, я не чувствовал себя там своим. Дома все намного привычнее, хотя и сложнее. Я хочу реализоваться в Беларуси. Да, сначала у меня возникали идеи по поводу того, чтобы остаться там жить постоянно. Особенно в первый месяц. Но потом я подумал, взвесил все за и против и решил, что лучше всего мне будет в Беларуси. Здесь мои родные и близкие люди".

Друг Антона, **Василий**, студент 4-го курса Белгосуниверситета, ездил по студенческой программе в Англию.

"Моя работа заключалась в сборе и прополке клубники, — рассказывает он. — Первое время было, конечно, тяжело привыкнуть к этой работе. Но со временем втянулся. Работали по 8 часов в день, зарплата устраивала. Правда, из-за плохой погоды мы часто не выходили на плантацию. Естественно, нам за эти дни не платили. За месяц можно было заработать тысячи две долларов. Жилищные условия вполне устраивали. Мы жили в лагере, в котором были два переносных бассейна, магазин, джакузи и прочие удобства. К нам в лагерь приезжали выступать музыканты. Недалеко находился город всего с 20-тысячным населением, но в нем было три гипермаркета. Нас централизованно возили на экскурсии по всей стране, многие впервые увидели океан..."

**Артем**, мой знакомый, ездил летом в гости к своему дяде в Украину, где устроился работать на стройку.

"Мне нужны были деньги на ноутбук, поэтому пошел работать, — объясняет он. — Работа была, конечно, тяжелой. Первое время мое расписание дня было таким: стройка, сон, стройка... и больше ничего. И так две недели. Потом привык к такому ритму жизни. В моем подчинении было шесть работников. А сначала моя работа заключалась в том, чтобы что-то принести или подать... Еда и жилье у меня были бесплатными. На новый ноутбук я все-таки насобирал".

ПОЗИЦИЯ МВД

## *Олег Слепченко,* *и.о.начальника управления информации МВД Беларуси:*

— Министерство внутренних дел отслеживает выезды студентов на работу за рубеж через фирмы, которые оказывают подобные услуги. Но чтобы получить лицензию на осуществление деятельности, связанной с трудоустройством граждан Республики Беларусь за границей, фирме нужно предоставить пакет бумаг. Порой не все это могут сделать. Именно поэтому в связи с перерегистрацией многие не получили разрешение на оказание подобных услуг. Они должны выполнить ряд условий, нарушение которых ведет к изъятию лицензии. Есть и такие фирмы, которые хорошо себя зарекомендовали. Обычно к ним при выдаче лицензии не возникает вопросов.

ПОЗИЦИЯ ДЕПУТАТА

## *Владимир Зданович,* *председатель комиссии по образованию, культуре, науке и научно-техническому прогрессу Палаты представителей:*

— Выезды студентов на работу за рубеж мешают учебе. Сначала в течение учебного года нужно позаботиться о получении визы, поиске рабочего места в той стране, куда выезжает студент. А затем еще и досрочно сессию сдать. В учебном заведении, кстати, не обязаны разрешать сдавать экзамены раньше, все зависит от руководства, пойдет ли оно навстречу. Но, как правило, с этим проблем не возникает. Ведь основная причина поездок студентов летом за рубеж — это совершенствование языковых навыков, знакомство со страной, а потом уже подработка и деньги. Именно поэтому в основном учащаяся молодежь ездит в Англию, США, Германию, Францию. У них есть возможность пообщаться непосредственно с самими носителями языка.

Бывало и так, что студент, выехавший по студенческой программе, оставался в чужой стране. Но такое, скорее всего, является исключением из общего правила. Большинство студентов возвращается в родную страну. Здесь их семья, корни, к тому же незаконченное образование. Бывает, что студент задерживается на неделюдве. В таком случае стоит предупредить деканат, чтобы потом не было проблем. В таком случае руководство пойдет навстречу. Был случай, когда ко мне обратился студент, приехавший в страну только к концу учебного семестра. Ему пришлось взять академический отпуск. Правда, не факт, что такие студенты будут восстановлены. Везде нужен индивидуальный подход.

Нам нужно самим создавать подобные программы, условия, чтобы у ребят не было необходимости выезжать за рубеж на трудоустройство. Было бы неплохо наладить обмен. Сейчас это единичные случаи, когда к нам в страну приезжают ребята из других стран.

ПОЗИЦИЯ ОТЦА И ЭКОНОМИСТА

## *Александр СОСНОВ, кандидат экономических наук, экс-министр труда:* *«Мой сын остался в Америке»*

— Лично я положительно отношусь к поездкам студентов летом за границу на работу. Это возможность заработать, посмотреть свет, увидеть, как живут люди в других странах. Только так можно понять, что у нас в стране не так уж все и хорошо, как многим кажется. Да, конечно, есть проблема трудовой миграции. Некоторая часть студентов за границей остается жить постоянно. А что делать? Нормальных условий для жизни нет в нашей стране. Пусть власти сначала создадут эти условия, тогда и проблема миграции исчезнет сама собой. Мой сын, будучи студентом, тоже ездил работать в США. Ему там понравилось, поехал и на второй год, правда, не вернулся обратно, остался жить и работать в Америке. Но я за него рад. Он поступил правильно. А что остается делать? У нас в стране никаких перспектив. Вот и остается молодежь на постоянное жительство в тех странах, куда ездили работать.

**Сергей ДМИТРИЕВ.**

КАДРЫ

## *Біятланісты пад наглядам КДБ*

Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Юрый Жадобін змяніў свайго папярэдніка Сцяпана Сухарэнку на пасадзе кіраўніка Беларускай федэрацыі біятлона.

Як паведаміў БелаПАН член прэзідыума федэрацыі Аляксандр Папоў, С.Сухарэнка падаў заяву аб складанні з сябе паўнамоцтваў старшыні БФБ "у сувязі са зменай месца працы". Пытанне аб намесніках новага кіраўніка федэрацыі будзе вырашацца пазней. Пакуль імі застаюцца Васіль Дземянцей (першы намеснік), Сяргей Булыгін, Аляксандр Хандогін і Рыгор Лядаў. В.Дземянцей з'яўляўся першым намеснікам С.Сухарэнкі ў КДБ. Абодва былі адпраўлены ў адстаўку 17 ліпеня 2007 года.

Беларускую федэрацыю біятлона традыцыйна ўзначальвае старшыня Камітэта дзяржбяспекі. Раней дзяржаўную і грамадскую пасады сумяшчалі Уладзімір Мацкевіч і Леанід Ерын.

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

СТАЛІЦА

## *Фіктыўныя шлюбы*

В'етнамскія студэнты фіктыўна жэняцца на немаладых мінчанках, каб пасля заканчэння вучобы застацца ў Мінску. У мінулым годзе толькі ў Доме шлюбаў было зарэгістравана 11 такіх "сем'яў". Амаль ва ўсіх пар аказалася вялікая розніца ва ўзросце - жаніх маладзейшы на 10—12 гадоў.

— Дасканала праверыць, ці фіктыўныя такія шлюбы, мы не здольныя, — расказвае кіраўніца Дома шлюбаў Надзея Равуцкая. — Дакументы ж усе ў поўным парадку, таму адмовіць у рэгістрацыі шлюбу мы не можам.

ШАХМАТЫ

## Миниатюра гроссмейстера
*В.Чепижный*

Белые: Крg2, Лf6, Лh1, Се1 (4).

Черные: Крg4, пп. g5, h6 (3).

Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахматной композиции двухходовую задачу-миниатюру российского гроссмейстера Виктора Чепижного. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: 220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".

**Сверьте ответы**

Композиция Н.Бельчикова ("Народная воля" за 11.01.): 1.Фа2!

## Памяти Р.Фишера

В столице Исландии Рейкьявике, городе, в котором он в 1972 году был увенчан лавровым венком чемпиона мира по шахматам, немного не дожив до 65 лет, умер выдающийся шахматист, 11-й в истории шахмат чемпион мира Роберт Фишер. Американский гроссмейстер был, безусловно, неоднозначной фигурой. Но сейчас совсем не хочется вспоминать о многочисленных конфликтах, которыми была насыщена его жизнь. Фишер был гениальным шахматистом, а гениям можно многое простить.

С шахматами Фишер познакомился в возрасте 6 лет. Научила его играть сестра. И королевская игра стала его страстью. Необычные способности мальчика проявились скоро. В 11 лет он победил в чемпионате Манхеттенского шахматного клуба, а в 1957 году впервые выиграл чемпионат США, опередив одного из сильнейших гроссмейстеров мира С.Решевского. О том, как играл тогда молодой Фишер, можно судить по партии, сыгранной им в Нью-Йорке в 1956 году с одним из сильнейших мастеров США Дональдом Бирном.

*Д.Бирн—Р.Фишер*
**Защита Грюнфельда**

I.Kf3 Kf6 2.c4 g6 3.Kc3 Cg7 4.d4 o-o 5.Cf4 d5 6.Фb3 dc 7.Ф:c4 c6 c6 8.e4 Kbd7 9.Лad1 Kb6 10.Фc5 Cg4 11.Cg5? Неудачный ход, который находит блестящее возражение. 11...Ka4!! Эффектный, далеко и точно рассчитанный комбинационный удар. 12.Фa3 (После 12.K:a4 K:e4! 13.Фc1 Фa5+ черные отыгрывали фигуру, оставаясь с лишней пешкой) 12...K:c3 13.bc K:e4! 14.C:e7 Фb6 15.Cc4 (Если 15.C:f8, то после 15...Cf8 16.Фb3 K:c3! Позиция белых разваливается) 15...K:c3! Не страшась призраков. Если теперь 16.Ф:c3, то 16...Лfe8 17.C:f7+ Кр:f7 18.Kg5+ Кр:e7 19.o-o C:d1 20.Л:d1, Фb5, и черные отражают атаку! 16.Cc5 Лfe8+ 17.Крf1 Се6! Блестящий ход. 18.C:b6 (Выбора нет. На 18.C:e6 будет 18...Фb5+, и белые получают спертый мат: 19.Крg1 Ке2+ 20.Крf1 Kg3++ 21.Крg1 Фf1+! 22.Л:f1 Ке2х!) 18...C:c4+ 19.Крg1 Ке2+ 20.Крf1 K:d4+ 21.Крg1 Ке2+ 22.Крf1 Kc3+ 23.Крg1 ab 24.Фb4 Лa4 25.Ф:b6 K:d1. В итоге у черных подавляющий материальный перевес.

Через несколько ходов Бирн сдался. Партия, которой мог бы гордиться любой известный гроссмейстер. А ведь победителю было всего 13 лет.

В 1958 году, после новой победы в чемпионате США (а всего он выиграл 8 чемпионатов страны, все, в которых принимал участие), Фишер выступает в межзональном турнире чемпионата мира в Портороже (Югославия). И вновь впечатляющий успех. Он набирает 12 очков из 20 и делит 5-е место, завоевывая право играть в турнире претендентов на титул чемпиона мира. Заодно американец становится самым молодым в истории шахматистом, выполнившим в 15 лет норму международного гроссмейстера.

В последующие годы Фишер демонстрирует высокий класс и добивается побед во многих крупнейших турнирах. Но наиболее впечатляющими были его результаты в период 1970—1972 годов. В межзональном турнире чемпионата мира, проходившем в 1970 году в Испании, Фишер занимает первое место, опередив на 3,5 очка (!) сильнейших гроссмейстеров Ефима Геллера, Бента Ларсена и Роберта Хюбнера. В том же году он с явным преимуществом выигрывает международные турниры в Буэнос-Айресе (второй призер отстал на 4,5 (!) очка) и Загребе.

В "Матче века", в котором сборная СССР встретилась со сборной мира (Белград, 1970 г.), Фишер со счетом 3:1 побеждает экс-чемпиона мира Тиграна Петросяна. Затем новая сенсация: в чемпионате мира по блицу, в котором играет весь цвет мировых шахмат, американец набирает 19 очков из 22, опередив занявшего второе место экс-чемпиона мира Михаила Таля на 4,5 (!) очка.

Но следующий год приносит новые, еще более оглушительные сенсации. В претендентских матчах Фишер со счетом 6:0 побеждает Марка Тайманова и Бента Ларсена, а в финальном матче Тиграна Петросяна — 6,5:4,5.

Теперь на пути к заветному чемпионскому званию одна преграда — чемпион мира Борис Спасский. Поединок между Фишером и Спасским, к которому было приковано внимание всего мира, приносит убедительную победу американскому гроссмейстеру — 12,5:8,5. Фишер — чемпион мира!

Увы, этот исторический матч стал фактически последним выступлением чемпиона в официальных соревнованиях. В 1975 году должен был состояться матч Фишера с Анатолием Карповым. Фишер выставил организаторам 64 условия, при которых он будет играть. 63 из них были приняты. Камнем преткновения стало требование чемпиона, что претендент, чтобы получить чемпионский титул, должен победить в матче с перевесом в 2 очка. В итоге на шахматный олимп взошел новый чемпион мира, а Фишер оставил шахматы.

Лишь в 1992 году он сыграл матч с Б.Спасским за баснословный гонорар — 5 миллионов долларов. И снова победил. Но это уже были другие и Фишер, и Спасский.

СУД

## *Больш не будзе пасылаць жонку на дарогу...*

**У якасці пакарання суд прызначыў яму 7 гадоў і 7 месяцаў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Вядома, што мужчына, які жыў недалёка ад трасы "Брэст—Масква", цягам некалькіх гадоў дапамагаў прастытуткам, якія працуюць непасрэдна на шашы.**

Спачатку ён прапаноўваў ім жытло, а пасля пачынаў жорстка кантраляваць заробкі і адбіраў грошы. Калі яму іх неставала, прымушаў ісці на дарогу ўласную жонку. Жанчына звярнулася ў міліцыю толькі пасля таго, як муж пачаў яе штодзённа збіваць.

Разам з ёй у якасці сведкаў выступілі і іншыя жанчыны, якія аказваюць "паслугі" кіроўцам. У якасці прычын таго, чаму пра злачынствы не стала вядома раней, жанчыны называюць сорам і адсутнасць іншых сродкаў для існавання.

СЛЫШАЛИ?

## *Куда уехал цирк?*

С 1 апреля здание столичного цирка закроется на реконструкцию.

Артисты временно переедут в шапито. Под его возведение выделена площадка возле Национальной библиотеки. Шапито вместит около двух тысяч зрителей.

Как рассказала директор — художественный руководитель Белгосцирка **Татьяна Бондарчук**, продолжительность цирковых программ будет несколько сокращена. Планируется, что работы по реконструкции здания цирка выполнят за год.

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

**У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 12.02.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №**